Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 160 (6739) | 11 ліпеня 1940 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.



ЗАКОНЧЫЦЬ ПАДПІСКУ НА ПАЗЫКУ ВЫСОКІМІ ПАКАЗАЛЬНІКАМІ

Падпіска на новую пазыку Трэцяй пяцігодкі (выпуск трэцяга года) па БССР расгортваецца неаслабяючымі тэмпамі. З дня ў дзень сума падпіскі расце. 2-га ліпеня яна складала 70.961 тысячу рублёў; 3-га — 152.879 тысяч рублёў; 4-га — 200.272 тыс. рублёў; 5-га — 229.001 тыс. рублёў; 6-га — 246.387 тыс. руб.; 7-га — 253.713 тыс. рублёў; 8-га — 256.421 тыс. руб.; 9-га — 260.465 тыс. руб.; 10-га — 284.754 тыс. рублёў.

На 10 ліпеня колькасць падпісаўшыхся на пазыку дасягае 2.143 тыс. чал.

Гэтыя лічбы красамоўны і яркі. Яны паказваюць, з якім патрыятычным уздымам сустрэў совецкі народ выпуск новай пазыкі, пазыкі далейшага росквіту і ўмацавання краіны соцыялізма.

У параўнанні з мінулым годам на гэты-ж самы тэрмін сума падпіскі (без заходніх абласцей) больш на 39 млн. 194 тыс. рублёў.

Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі падпісаліся на 43.735 тыс. рублёў.

Што новага ў рэалізацыі пазыкі ў гэтым годзе? Гэта тое, што па ініцыятыве саміх калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў падпіска замацоўваецца грашовымі ўзносамі. На 10 ліпеня паступіла наяўнымі 6.630 тысяч рублёў.

Працоўныя заходніх абласцей дружнай падпіскай на пазыку дэманстрыравалі сваю адданасць партыі Леніна—Сталіна і совецкаму ўраду. Рэалізацыя пазыкі праходзіць там на высокім палітычным узроўні. Сума падпіскі дасягае 92.897 тысяч рублёў.

Аднак трэба адзначыць, што ў асобных абласцях нашай рэспублікі недастаткова ўвагі ўдзяляюць далейшаму разгортванню падпіскі на сяле.

Хаця сума падпіскі сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў Віцебскай вобласці перавысіла на гэты тэрмін суму падпіскі мінулага года, ўсё-ж праведзеную работу трэба лічыць яўна недазвальняючай. Гэта тлумачыцца тым, што абласныя і раённыя арганізацыі аслабілі масава-раз'яснёльную работу сярод насельніцтва.

Не ўсюды разгорнута барацьба за замацаванне падпіскі грашовымі ўзносамі. Па Віцебскай вобласці, напрыклад, паступіла наяўнымі грашыма ўсяго 274 тысячы рублёў. Гэта яўна недастатковая сума сведчыць аб нездавальняючай рабоце.

Новая пазыка Трэцяй пяцігодкі (выпуск трэцяга года) карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва. Але поспех размяшчэння яе будзе яшчэ большым, калі ў астаўшыяся дні партыйныя, комсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, камсоды, упаўнаважаныя па падпісцы на пазыку па-баявому, па-большэвіцку арганізуюць масава-раз'яснёльную работу на сяле, даб'юцца, што ўсе калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі ў самых аддаленых кутках нашай рэспублікі падпішуцца на пазыку Трэцяй сталінскай пяцігодкі.

І. З. СЦЯПАНАЎ,
нарком фінансаў БССР.

ДВАЦЦАЦІГОДДЗЕ РАЗГРОМУ БЕЛАПАЛЯКАЎ

Сёння, 11 ліпеня,—радаснае свята белаускага народа — дваццацігоддзе вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў. 11 ліпеня 1920 года гераічная Чырвоная Армія вызваліла сталіцу БССР — Мінск ад польскіх захватчыкаў і этым самым паклала пачатак канчатковаму вызваленню ўсёй Беларусі ад гнёту панскай Польшчы.

20 год таму назад пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі ў панікі ўцякалі польскія інтэрвенты. Намаганнямі Чырвонай Арміі і беларускіх партызан польскія паны былі выгнаны з Беларусі. Над сталіцай Беларусі — Мінскам узвіўся непераможны чырвоны сцяг Совецкаў.

Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка з'яўляецца дзецішчам ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Геніяльнае адкрыццё В. І. Ленін і І. В. Сталін паказалі прыгнечаным народам правільны шлях да вызвалення ад гнёту эксплаататараў. Партыя большэвікоў, Ленін і Сталін адыгралі першую ў гісторыі далі дзяржаўнасць беларускаму народу. Польскія паны — векавечныя ворагі беларускага народа — не раз прабавалі напасці на краіну Совецкаў. У першыя-ж дні пасля перамогі пралетарыяцкай соцыялістычнай рэвалюцыі знавяльможныя паны мабілізавалі контрэвалюцыйныя сілы і напалі на маладую краіну Совецкаў. Чырвоная Армія пад кіраўніцтвам і Рагачовам нанесла моцны удар па польскіх інтэрвентах у асобе корпуса Доўбар-Мусніцкага.

Вясной 1919 года польскія паны па загаду англа-французскіх капіталістаў арганізавалі новы паход на совецкую рэспубліку. Польскія памешчыкі да перадачы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі ўладалі ў Беларусі дзесяткамі маёнткаў і лепшымі землямі. Польскія паны ў сваіх планах не абмяжоўваліся толькі зваротам маёнткаў. Яны сталі сваёй мэтай захапіць Беларусь і заходнюю частку Украіны, аднавіць у гэтых раёнах сваю ўладу, стварыць вялікую Польшчу ад мора да мора», гэта значыць ад Балтыйскага да Чорнага.

Партыя большэвікоў у дапамогу беларускаму народу для арганізацыі барацьбы супроць польскіх захватчыкаў паслала вялікага друга беларускага народа таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў—Арджанікідзе і Калініна. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна беларускі народ падняўся на гераічную барацьбу супроць белапалякаў, на абарону завяванняў вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. У рэзультаце геніяльнага кіраўніцтва таварыша Сталіна наступленне белапалякаў на заходнім фронце было спынена.

Вясной 1920 года англа-французскія імперыялісты арганізавалі трэці паход супроць краіны Совецкаў, і ў гэтым паходзе галоўную ролю адыгрывала панская Польшча. У сувязі са здрадніцкай пазіцыяй Іуды-Троцкага белапаляякі атрымалі некаторыя поспехі. 6 мая 1920 года войскі Пілсудскага занялі Кіеў, захапілі ад гарадоў Совецкай Беларусі.

Ленін і Сталін мабілізуюць сілы краіны для таго, каб разграміць нашэсце панскай Польшчы. «Раз справа дайшла да вайны, — гаварыў Ленін, — то ўсё павінна быць падпарадкавана інтарэсам вайны, усё ўнутранае жыццё краіны павінна быць падпарадкавана вайне і ні малейшае хістанне наконт гэтага недапушчальна» (Ленін, т. 25, стар. 261.)

Тав. Сталін выпрацаваў геніяльны план разгрому польскіх захватчыкаў. Па ранэнню Леніна і Сталіна на фронт для барацьбы з белапалякамі былі перакінуты лепшыя часці Чырвонай Арміі: гераічная Першая Конная Армія, 25 Чапаеўская дывізія, 44 Шчорсаўская дывізія, корпус Катоўскага і інш.

Большэвікі Беларусі пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна правялі мабілізацыю сваіх сіл для рашучага адпору польскім захватчыкам. Партыйныя арганізацыі Віцебска, Гомеля, Бабруйска і іншых гарадоў мабілізавалі на фронт комуністаў і комсамольцаў.

5 чэрвеня 1920 года па дырэктыве таварыша Сталіна Першая Конная Армія пад кіраўніцтвам таварышаў Варашылава і Буднёнага прарвала польскі фронт і заняла Жытомір. Гэты прарыў стварыў рашаючы пералом.

4 ліпеня 1920 года часці Чырвонай Арміі перайшлі ў рашучае наступленне па ўсяму заходняму фронту. Гераічнае наступленне III, IV, XV, XVI Чырвоных Армій прымусіла белапалякаў у панікі ўцякаць з Беларусі. Сотні вялікіх і малых партызанскіх атрадаў з рабочых і сялянскай беднаты наносілі ўдары іншакраінным захватчыкам. Чырвоная Армія 8 ліпеня заняла горад Барысаў, а праз тры дні, 11 ліпеня, 27 Омская і 17 дывізіі Чырвонай Арміі разграмілі белапольскія ўмацаванні і вызвалілі ад паноў Мінск—сталіцу Беларускай ССР.

Беларускі народ пры дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна перамог сваіх векавечных ворагаў — польскіх паноў і дабіўся соцыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія нанесла рад сакрушальных ударах белапалякам і іх лакаям — буржуазным нацыяналістам і дайшла да Варшавы і Львова. Толькі здрадніцкая дзейнасць агентаў буржуазіі—Троцкага і Тухачэўскага перашкодзіла поўнаму разгрому панскай Польшчы.

За 20 год, прайшоўшых з таго часу, калі Чырвоная Армія нанесла рашучы ўдар белапалякам, непазнавальна вырасла эканамічная і ваенная магутнасць нашай краіны.

У верасні 1939 года, выконваючы волю совецкага народа, Чырвоная Армія вызваліла з-пад гнёту панскай Польшчы сваіх адзінакроўных братоў з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Назаўсёды пакладзен канец векавому прыгнечанню беларускага народа. З'яднаны беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна разам з многанацыянальнай сям'ёй народаў Совецкага Саюза з вялікім творчым энтузіязмам будуе сваё новае, радаснае, шчаслівае жыццё.

Вялікая сіла зброі совецкага народа! Непераможна яго армія!

Няхай не забываюць усе ворагі совецкага народа, што ўсякія іх спробы ўціскуць нас у вайну скончацца для іх поўным разгромам, няхай памятаюць яны ўрокі грамадзянскай вайны.

Увесь наш народ аднадушна паднімецца на ворага і абрушыць на яго ўсю грозную сілу совецкай зброі.

Падпіска ў Мінску

На 10 ліпеня падпіска на пазыку Трэцяй сталінскай пяцігодкі (выпуск трэцяга года) па гораду Мінску дасягнула 33.200 тысяч рублёў — на 7.485 тысяч рублёў больш, чым у мінулым годзе на гэты тэрмін.

Агульная колькасць падпісчыкаў складае 89.650 чалавек.

Усяго закончылі падпіску па Мінску 630 прадпрыемстваў і ўстаноў.

Заслужаны дзеяч навукі БССР акадэмік І. Т. Тітоў падпісаўся на 2.500 рублёў. Ён поўнасцю ўнёс грошы наяўнымі.

У прамысловых арцелях

Усе рабочыя швейнай фабрыкі мінскай прамысловай арцелі «Пролетарый» падпісаліся на пазыку Трэцяй пяцігодкі. Агульная сума падпіскі па фабрыцы складае 85 тысяч рублёў. Загадчык вытворчасцю тав. Серман, загадчык складам тав. Шапіра і іншыя падпісаліся звыш чым на месячны аклад. Рабочыя-стаханаўцы тт. Гольдберг, Цукерман, Гурвіч, Франзон, Штэрн, Баум і многія іншыя падпісаліся на месячны заработак.

Паспяхова прайшла рэалізацыя пазыкі сярод членаў прамысловай арцелі «Стаханавец». Напрыклад, стаханавец тав. Баркан І., атрымліваючы ў месяц 950 рублёў, падпісаўся на 1.000 рублёў, стаханавец тав. Грандо М. — па месячны заработак — 930 рублёў, стаханавец тав. Квас — на 750 рублёў.

З вялікім уздымам праходзіць рэалізацыя пазыкі ў прамысловых арцелях «Чырвоны металіст» і імені Крупскай.

В. ІВАНОВІЧ.

Вялікая актыўнасць калгаснага насельніцтва

ДУБРОЎНА. На 9 ліпеня працоўныя раёна падпісаліся на новую пазыку на суму 1.021.760 рублёў. 4.354 падпісчыкі — рабочыя і служачыя далі ў пазыку дзяржаве 813.850 рублёў. 6.078 калгаснікаў падпісаліся на суму 203.425 рублёў. Працоўныя аднаасобнікі і неарганізаванае насельніцтва гэтага раёна ў колькасці 187 чалавек падпісаліся на 4.485 рублёў.

З кожным днём павялічваецца колькасць калгаснікаў, якія ўносяць грошы наяўнымі. 87 калгаснікаў сельгасарцелі «Прамень Кастрычніка» (Дубровенскі горсовет) падпісаліся на 4.127 рублёў. наяўнымі ўнеслі 2.450 рублёў. 76 калгаснікаў сельгасарцелі імені Дзержынскага (Барынскі сельсовет) падпісаліся на пазыку на суму 3.640 рублёў, наяўнымі ўнесена 1.945 рублёў. 57 калгаснікаў сельгасарцелі «Трудавік», тэтага-ж сельсовета, падпісаліся на суму 2.760 рублёў і ўнеслі ў ашчадкасу 1.200 рублёў.

МІНСКІ РАЁН ЗАКОНЧЫЎ УВЯДЗЕННЕ СЕВААБАРОТАЎ

Выконваючы рашэнні XVIII з'езда ВКП(б), Мінскі раён закончыў увядзенне правільных севаабаротаў ва ўсіх 102 калгасах. У 1940 г. уведзены і перанесены ў натуру 34 севаабароты.

Сакратар Мінскага райкома КП(б)Б СЦЕПАНЕНКА.
Старшыня выканкома райсовета ГЕРМАН.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС
аб стратах японскай авіяцыі на Халхінголе

У Японіі агенцтва Домей Цусін паведаміла па радыё, што ў сувязі з трэцяй гадавінай япона-кітайскай вайны, аддзел друку штаба японскай арміі апублікаваў афіцыяльнае паведамленне аб выніках ваенных дзеянняў у Кітаі за 3 годы. У гэтым паведамленні побач з данымі аб выніках ваенных дзеянняў у Кітаі аб'яўлена, што «на граніцы Манчжоу-Го і Знешняй Манголіі японскія самалёты збілі 1.340 совецкіх самалётаў і 30 совецкіх самалётаў знішчылі на зямлі», і далей указана, што японцы на граніцы Манчжоу-Го і Знешняй Манголіі страцілі 138 самалётаў.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што прыведзеныя вышэй «даныя» аддзела друку штаба японскай арміі не толькі не адпавядаюць сапраўднасці, але з'яўляюцца яшчэ смехатворнымі. На самой справе па афіцыяльных даных Генштаба Чырвонай Арміі японцы за час канфлікта на граніцы МНР і Манчжоу-Го ў раёне Халхінгола з 15 мая па 30 жніўня 1939 года страцілі 589 самалётаў. Мангола-совецкая авіяцыя за гэты-ж перыяд страціла 106 самалётаў. Апрача таго за час ад 30 жніўня па 15 верасня 1939 года мангола-совецкай авіяцыяй быў збіт яшчэ 71 японскі самалёт. Мангола-совецкая авіяцыя страціла за той-жа перыяд 37 самалётаў.

Усяго за час канфлікта на граніцы МНР і Манчжоу-Го японцы страцілі 660 самалётаў, а страты мангола-совецкай авіяцыі склалі 143 самалёты.

Перадвыбарная кампанія ў Латвіі

РЫГА, 9 ліпеня. (ТАСС). Міністр земляробства Латвіі, спыняючыся на задачах сельскай гаспадаркі рэспублікі, заявіў у прамове на сходзе аграномаў:

«Важнейшай задачай з'яўляецца ўзорнае праведзенне выбараў у новы сейм. Аграномы павінны ўключыцца ў гэтую работу. Вы павінны паехаць у вёску і сказаць народу, што яго лёс знаходзіцца ў яго ўласных руках, што ўсе павінны 14—15 ліпеня ўдзельнічаць у выбарах сейма. Сялянства само па аснове свабодных выбараў вырашыць каму яно даверыць сваё будучае, каго трэба выбраць у народны парламент. Я ўпэўнен, што сялянства пойдзе разам з рабочым класам. Увесь народ, усе працоўныя павінны згуртавацца вакол свайго ўрада. Наш лозунг — дэмакратычная Латвія. Правакатары сеюць панічныя чуткі аб канфіскацыі ў сялян зямлі, жывёлы і інвентара. Трэба выкрываць такіх правакатараў. Урад спадзяецца, што аграномы пакажуць 14—15 ліпеня сваю адданасць народу, галасуючы за кандыдатаў групы «Саюз працоўнага народа Латвіі».

РЫГА, 9 ліпеня. (ТАСС). На сходзе членаў праўленняў рэвізійных камісій рыжскіх прафсаюзаў і культурных арганізацый, на якім прысутнічалі прадстаўнікі 34 прафсаюзных і культурных арганізацый, выступіў першы сакратар Цэнтральнага камітэта компартыі Латвіі Закіс.

Сход прыняў рэзалюцыю, у якой указваецца, што «праўленні рэвізійных камісій рыжскіх прафсаюзаў аднагалосна далучаюцца да выбарчай платформы групы «Саюз працоўнага народа Латвіі». «Мы заклікаем, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — усіх членаў прафсаюза актыўна ўдзельнічаць у выбарах у сейм і галасаваць за кандыдатаў групы».

ПЕРАДВЫБАРНЫЯ МІТЫНГІ І СХОДЫ Ў ЛІТВЕ

КАУНАС, 9 ліпеня. (ТАСС). Як паведамляе Літоўскае тэлеграфнае агенцтва, перадвыбарныя сходы і мітынгі праводзяцца па ўсіх гарадах, сёлах і вёсках Літвы. Сходы і мітынгі праходзяць пры выключнай актыўнасці ўсіх працоўных. Не гледзячы на супраціўленне памешчыкаў, батракі, працоўныя ў маёнтках, прынялі актыўны ўдзел у перадвыбарных сходах.

Выбарчая платформа групы «Саюз працоўнага народа Літвы» і высунутыя ёю кандыдаты ў дэпутаты сейма сустракаюць аднадушнае падтрымане працоўных.

Учора многатысячны мітынг рабочых прадпрыемстваў «Майстас» прыняў рэзалюцыю, поўнасцю адабраючую выбарчую платформу групы «Саюз працоўнага народа Літвы».

Як паведамляе газета «Лістувос айдас», у Укмергу адбыўся 15-тысячны мітынг працоўных. Сабраўшыяся адобрылі выбарчую платформу групы «Саюз працоўнага народа Літвы» і вылучылі сваімі кандыдатамі ў дэпутаты сейма міністра шляхоў зносін Стасіса Пупейкіса, селяніна Іонаса Валашынскаса, селяніна Владаса Гудаускаса, селяніна Іонаса Абаконіса, селяніна Юргіса Алішаускаса, селяніна Адомаса Дамбраускаса, пісьменніка Людаса Гіра (генеральны сакратар міністэрства асветы), рабочага Альфонса Чэснуціса і журналіста Алексаса Гузевічуса (віцэ-міністр унутраных спраў).

На мітынгу ў Ладзняй пяць тысяч працоўных вылучылі сваімі кандыдатамі ў дэпутаты сейма пісьменніка Петраса Цвірка і міністра юстыцыі Літвы Павіласа Пакаркліса.

КАУНАС, 9 ліпеня. (ТАСС). На 11 ліпеня ў Каунасе назначана дэманстрацыя збліжэння працоўных горада з працоўнымі вёскі. На дэманстрацыю прыбудуць сялянскія дэлегацыі з ваколічных валасцей і вёсак.

Пауль Кеердо—галоўны палітычны кіраўнік эстонскай арміі

ТАЛІН, 9 ліпеня. (ТАСС). Прэзідэнт Эстонскай рэспублікі назначыў галоўным палітычным кіраўніком эстонскай арміі і ваеннага міністэрства Пауля Кеердо.

Пауль Кеердо нарадзіўся ў 1891 г. у Тарту. Пачынаючы з 1912 года, Пауль Кеердо актыўна ўдзельнічае ў рабочым руху Эстоніі. Відны журналіст. У 1924 г. быў прыгаворан да пажыццёвай катаргі (амністыраван у 1938 г.). П. Кеердо—член Цэнтральнага камітэта комуністычнай партыі Эстоніі.

«Уступленне Чырвонай Арміі ў горад Мінск у 1920 годзе». Карціна мастака Е. А. Зайцава.

УРОКІ ГІСТОРЫІ

Дваццаць год назад англа-французскія імперыялісты нацкавалі на Совецкую Расію свайго вернага пса—панскую Польшчу. Аснашчоныя першакласнай для таго часу ваеннай тэхнікай, рушылі вымуштраваныя армії інтэрвентаў на маладую краіну Советаў. Патокамі крыві залілі яны беларускую зямлю, сотнямі шыбеніц пакрылі яе, у агні пажараў палалі гарады і вёскі; на фабрыкі вярнуліся капіталісты, у вёсцы стаў зноў гаспадарыць памешчык. У цяжкіх кайданах няволі апынуліся рабочыя і сяляне.

Але надоўга пратрымалася панская ўлада. Партыя Леніна—Сталіна паслала гераічную Чырвоную Армію на вызваленне беларускага народа. У гарадах, мястэчках і вёсках працоўныя паўсталі супроць белапольскага гнёту. «Уставай на ворага, люд галодны!» — пракаціўся магутны кліч.

«Вораг прагны, хітры і багаты, яму ёсць дае і ёсць на што купіць дастатковую колькасць «пушачнага мяса». Ён можа купіць... палякаў... Наш працоўны народ павінен гэта ведаць, але ён можа глядзець у будучае без страху, — абарона ў яго выдатная — не толькі тэму, што ў яе добрыя штыкі, але галоўнае таму, што яе ўзброілі непераможнай праўдай»... Гэта праўда, аб якой пісаў у свой час Максім Горкі, перамагла ў 1920 г. Слаба ўзброеныя, разутыя, поўгалодныя, стомленыя чырвоныя палкі разграмілі, ушчэнт разбілі фанабэрыстую польскую шляхту.

Польскія паны «ніколі не рабілі ў гісторыі нічога іншага апрача... драчлівых бязглуздзіц» — гэтыя словы Фрыдрыха Энгельса, сказаныя ў 1851 г., зноў поўнасцю апраўдаліся.

Успомнім некаторыя эпізоды тых гераічных слаўных дзён.

У ноч з 7 на 8 ліпеня 1920 г. ля Барысава і некалькі на поўдзень ад м. Бярэзіна часці XVI арміі фарсіравалі раку Беразіну. Пасля ўпорнага бою белапалякі пакінулі Барысаў, спалены і зруйнаваны акупантамі. Ужо к вечару 7 ліпеня галоўныя сілы XVI арміі, разграміўшы праціўніка, прасунуліся па 15—20 кілометраў уперад на захад ад Бярэзіны. У часцях белапалякаў пачалася дэмаралізацыя. Многа салдат і афіцэраў пакінулі свае часці і разбегліся па лясах. Нашы войскі, захваціўшы палонных і вялікую колькасць зброі, з велізарным парывам праследвалі ворага.

Польскае камандаванне зрабіла адчайную спробу спыніць наступленне Чырвонай Арміі на новай абарончай лініі ў раёне рэк Свіслач і Волма. Часці Чырвонай Арміі разграмілі і другую абарончую паласу. 8-я стралковая дывізія ў раёне вёскі Жукавец разбіла другую польскую дывізію і праследвала яе да ст. Міханавічы. 10 ліпеня палкі дывізіі выйшлі да р. Свіслач у раёне Сінела і смелым манеўрам перайшлі яе. Поспех дывізіі забяспечыў прарыў паласы абароны праціўніка на ўсход ад Мінска. Ва ўтвораную прабоіну хлынулі чырвоныя часці.

Незадачлівыя польскія ваякі разгубіліся. Яны высунулі заслон на лінію вёсак Азярышча, Баравая — на поўнач ад Мінска. Там яны падрыхтавалі пазіцыі, умацаваныя чатырма радамі дротавай загароды. Слаўная 17-я стралковая дывізія ў памятныя дні ліпеня 1920 года ўпісала гераічныя старонкі ў гісторыю вызвалення Беларусі.

Раніцай 11 ліпеня 1920 г. чырвоная артылерыя адкрыла сакрушальны агонь па варожых умацаваннях ля вёскі Азярышча і затым палкі дывізіі пайшлі ў наступленне. Белапалякаў адкінулі да Сляпянкі. У той-жа час гераічная 27-я Омская дывізія прарвала фронт праціўніка ля вёскі Дражын. Белапалякі ў паніцы адступалі. Іх праследвалі па пятах.

У 14 гадзін 30 мінут 11 ліпеня часці 27-й і 17-й дывізій увайшлі ў Мінск. Працоўныя сталіцы з лікаваннем і вялікай радасцю сустракалі сваю збавіцельніцу — Чырвоную Армію. Чырвоны сцяг Советаў узвіўся над сталіцай Беларусі.

«Беларускія партызаны ў таварыша Сталіна ў штабе Рэўваенсовета Заходняга фронта». Карціна мастака Н. А. Пашкевіча.

ГЕРОІКА ТЫХ ДЗЁН

ТЫСЯЧА дзевяцьсот дзевятнаццаты год... Гэта быў суровы, цяжкі час.

Маладая Беларуская Совецкая Рэспубліка, створаная Леніным і Сталіным, прыступіла да аднаўлення сваёй гаспадаркі. Беларускі народ пачаў будаваць совецкае соцыялістычнае жыццё.

Але ў гэты час з захада пагражаў новы вораг. Польскія паны ненавідзелі маладую рэспубліку Советаў. З'яўляючыся паслухмянай зброяй у руках Антанты, панская Польшча рушыла свае войскі на совецкую рэспубліку.

Агнём і мячом прайшлі польскія войскі па гарадах і сёлах Беларусі. Яны сеялі смерць, знішчалі ўсё, што сустракалі на сваім шляху. Як дражэны звер прыходзіць у ярасць, убачыўшы вроў, так польскія генералы і афіцэры прыходзілі ў ярасць, убачыўшы свабоднае жыццё совецкіх гарадоў і сёл.

Гарэлі гарады. Гарэлі вёскі. Неба было пакрыта заравам пажарышчаў. У паветры пахла парахавым дымам. А ў сэрцы беларускага народа гарэў агонь нянавісці, гневу і абурэння.

Зямля стагнала ад болю. Ёй было несцярпіма, што яе топчуць сваімі брудными ботамі польскія шляхецкія войскі.

Праціўнік меў значную перавагу. Мінск знаходзіўся пад патрозай. Гэта былі трывожныя дні. Трэба ўтрымаць сталіцу рэспублікі. Нельга аддаваць яе ворагу. Трэба скарыстаць усе сродкі, зрабіць усё магчымае. Так патрабуе рэволюцыя.

Ваенныя ўлады Мінска, сярод якіх было нямала польскіх шпіёнаў і контрэволюцыянераў, думалі інакш. Яны гаварылі, што Мінск утрымаць нельга, яго трэба здаць без бою.

Абстаноўка была складаная. Маладая рэспубліка перажывала цяжкі момант. Заходні фронт стаў адным з рашаючых. Ён патрабаваў моцнага ваеннага і палітычнага кіраўніцтва. Толькі такое кіраўніцтва магло выправіць становішча, затрымаць наступленне ворага, арганізаваць контрнаступленне, а потым разбіць праціўніка.

Партыя большэвікоў, Ленін ведалі, каго трэба паслаць на заходні фронт.

Партыя большэвікоў, Ленін ведалі, хто можа забяспечыць перамогу над ворагам.

Гэта — Сталін.

І вось у самы напружаны момант на заходні фронт прыбыў Сталін.

Ён прыбыў сюды з другога фронта. Сталін кіраваў гераічнай абаронай Петраграда. Гэта дзякуючы яго стратэгічнаму генію Юдзеніч, белафіны і англійскі флот былі адкінуты ад Петраграда. Гэта яго цвёрдай рукой быў падаўлен мяцеж на фортах «Красная Горка» і «Серая Лошадь».

Становішча на заходнім фронце было цяжкое.

Камандуючы фронтам — былы генерал царскай арміі — быў зусім непрыгодны як кіраўнік рэволюцыйнага фронта. У часцях не адчувалася сапраўднага палітычнага кіраўніцтва. Здраднік Троцкі даваў распаражэнні, якія выклікалі аслабленне сіл Чырвонай Арміі.

Таварыш Сталін узяўся за навядзенне парадку на фронце і ў тылу. Па яго распараджэнню быў назначан новы камандуючы фронтам. Пад яго кіраўніцтвам фронт быў адароўлен. Часці былі перагрупіраваны. Апрача ваеннай падрыхтоўкі разгарнулася ў шырокіх размерах палітычная і партыйная работа. Яна праводзілася пад кіраўніцтвам Сталіна.

Вораг наступаў к Мінску.

У гэты час каля Александраўскага вакзала стаяў скромны вагон. З гэтага вагона ішлі баявыя загады, мудрыя распараджэнні, закладныя ўказанні. Здавалася, сама рэволюцыя пасылае свае дырэктывы, намячае шляхі далейшага прасоўвання ўперад. Тут, у гэтым вагоне, заўсёды ішлі разгаворы—то голасныя, то ціхія. Заўсёды, днём і ноччу тут абмяркоўваліся справы, планы, перспектывы. Гэта быў цэнтр стратэгічнай мысліі, ваеннага і палітычнага кіраўніцтва. Баявыя загады, якія адсюль пасылаліся, ператвараліся на фронце волаю большэвікоў у гераічныя справы ў імя рэволюцыі.

У вагоне каля мінскага вакзала жыў чатыры—пяць дзён член Рэвваенсовета, правадыр, палкаводзец, стратэг, салдат рэволюцыі.

У гэтым вагоне жыў Сталін.

Абарона Мінска арганізоўвалася цвёрдай рукой.

На дапамогу беларускаму народу прышлі рускія рабочыя і сяляне.

Усе комуністы горада былі мабілізаваны. Выраслася лёс рэспублікі. Вырашалася будучыня народа. Установы закрываліся. Аб'явы на дзвярах гаварылі: «Усе пайшлі на фронт». Профсаюзы стварылі рабочы полк. Комсамол з уласцівым яму запалам і энергіяй узяўся за вывучэнне ваеннай справы і ўліваўся ў рады арміі.

Становішча ў горадзе было цяжкае. Недахоп харчавання. Неасветленыя вуліцы.

Было мала вінтовак і патронаў. Але было многа мужнасці і гераізма. Нехапала абмундзіравання. Але было жаданне ва што-б та ні стала абараняць горад і рэволюцыю.

Каля Александраўскага вакзала стаяў вагон...

Да яго цягнуліся сэрцы людзей. Сюды ішлі быцкам па тэлеграфнаму проваду іх мысліі, іх спадзяванні, іх надзеі.

У вагоне знаходзіўся Сталін.

Маці, сын якой пайшоў на фронт, прыходзіла сюды паглядзець на чалавека, які забяспечвае перамогу і рыхтуе будучыню ёй і яе дзецям.

Жонка, муж якой пайшоў на фронт, прыходзіла сюды паціснуць руку чалавеку, які адлае ўсяго сябе для таржаства праўды на зямлі.

Сястра, брат якой пайшоў на фронт, прыходзіла сюды паглядзець на чалавека, якога прыслаў Ленін для таго, каб вычысціць беларускую зямлю ад польскіх паноў.

Сорак дзён прадаўжалася гераічная абарона Мінска. Гэта былі дні, поўныя нечуванага напружання, найвялікшай мужнасці і небывалага гераізма.

Свабодалюбівы беларускі народ смела глядзеў у вочы сваёй будучыні. Так могуць глядзець у будучыню толькі людзі, упэўненыя ў праваце сваёй справы, ведаючыя, чые інтарэсы яны абараняюць і ў імя чаго яны змагаюцца.

Польскія войскі ў пачатку жніўня 1919 г. атрымалі значнае падмацаванне. Яны павялі новае наступленне на Мінск. Чырвоная Армія гераічна абараняла горад і толькі пасля ўпорных баёў вораг аваладаў ім.

Чырвоная Армія ўмацавалася на новых пазіцыях — на рубяжы — рацэ Беразіне.

Таварыш Сталін асабіста арганізоўваў абарону на новым рубяжы. Ім была ўтворана ўдарная група 16-й арміі пад кіраўніцтвам Серго Орджанікідзе. Таварыш Сталін разам з Орджанікідзе распрацаваў стратэгічны план разгрому польскіх войск.

Быў сабран моцны ваенны кулак. Усё было падрыхтавана для наступлення. Трэба было пачакаць зручнага моманту. І гэты момант наступіў.

Быў ліпень 1920 года. Стаяла нясцерпная спякота. Зямля дрыжэла ад грукату. Гэта ішлі ў рашучае наступленне на ворага доблесныя воіны Чырвонай Арміі.

Магутным шквалам рушылася Чырвоная Армія. Яна адкідвала ворага з вялікімі для яго стратамі. Мужныя воіны рэволюцыі неслі на сваіх сцягах свабоду свайму змучанаму краю. На пяціканцовых звёздах чырвонаармейцаў гарэла сонца.

Польская армія на чале з сваімі генераламі і афіцэрамі з выключнай хуткасцю ўцякала з межаў Беларусі, праследуемая Чырвонай Арміяй.

Мінск зноў і назаўсёды стаў горадам совецкім.

С. КУНЯЎСКІ.

УРОКІ ГІСТОРЫІ

Амаль праз дваццаць год на палі бітваў аноў сустрэлася Чырвоная Армія з незадачлівымі польскімі ваякамі. За гэты час расквітнела Беларуская ССР. Яна стала магутным фарпостам вялікай, моцнай совецкай дзяржавы. Узброеная грозпай ваеннай тэхнікай, памножанай на непераможную большэвіцкую праўду Чырвоная Армія ў незабыўныя дні верасня 1939 г. з чэсцю выканала сваю гістарычную місію. Яна ўступіла на землі Заходняй Беларусі, як армія-вызваліцельніца. Яна прынесла працоўным, прытлачаным драпежным польскім арлом, свабоду, радасць і шчасце. Фанаборыстыя паны былі канчаткова разгромлены. Армія пабудаваная на чыста знадворным блеску, увасабляўшая сабой рэжым насілля і прычынчання, разляцелася як картачны домік. Польскія паны яшчэ раз паспрабавалі ўсю сілу совецкай зброі. Кічліваю польская дзяржава Бекаў, Масціцкіх, Радзівілаў і Патоцкіх аказалася мыльным пузыром.

На сцягу 84-га польскага стралковага палка, захвачаным у баі пад Шацкам, былі золатам вышыты гучныя словы: «Гонар і айчызна». Чаго, чаго, а гонару ў незадачлівых, задзірыстых паноў хапала! Жыццё паказала ўсю цану панскага «гонару». А сваю «айчызну» яснавяльможныя магнаты і генералы быстра кінулі на волю лёсу. Ім было не да яе. Трэба было ратаваць свае чамаданы.

У баях за вызваленне Заходняй Беларусі чырвоныя байцы, камандзіры і камісары паказалі ўзоры гераізма, мужнасці, адваті і бясстрашша. Маладыя байцы змагаліся з такой-жа мужнасцю і храбрасцю, як іх бацькі і браты ў вогненныя гады грамадзянскай вайны.

Танкавы батальён пад камандаваннем маёра Палукарава першым уступіў у Гродна і пачаў граміць ворагаў. Праціўнік закідваў нашы танкі гранатамі, абстрэльваў іх з гарматных кулямётаў. Афіцэры прабавалі запаліць нашы машыны, кідалі ў іх бутэлькі з карасінам, але адважныя танкісты паспяхова выканалі сваю задачу: яны разграмілі аспёўныя ачаг супраціўлення, не страціўшы ні адной машыны.

Выключную храбрасць і ваенную хітрасць праявіў старшы палітрук Чэламіткіна. Па лодцы праз Нёман ён адзін з першых прабраўся ў горад. Ён адзін знішчыў вялікую колькасць польскіх афіцэраў.

Выконваючы ваенную прысягу, баец-разведчык Шэнкурук бясстрашна разброіў чатырох польскіх афіцэраў і даставіў іх у штаб. Палітрук Какарын, цела якога пакрывалі 16 ран, адважна кінуўся ўперад на польскую заставу і пад ураганным агнём аўладаў ёю. Воіны Чырвонай Арміі рабілі сутачныя маршы па 94 кілометры, учацвярох бралі ў палон 70 ворагаў, ручным кулямётам збівалі польскія самалёты, узрывалі гранатамі жалезабетонныя ўмацаванні, ішлі ўперад, толькі ўперад.

У часе аднаго з баёў быў забіт чырвоаармеец Гутнікаў. Пры ім знойдзена такая запіска: «Калі мяне заб'юць, то хто знойдзе мяне, паведаміце бацьку, што я загінуў за справу вызвалення беларускага народа ад польскіх паноў. За вялікага Сталіна і нашу партыю не шкадую свайго жыцця».

Якая сіла магла ўстаяць перад такімі героямі!

Насельніцтва Заходняй Беларусі са слязамі радасці на вачах сустракала сваіх вызваліцеляў. У бляску чырвоных звёзд на фуражках байцоў нашы браты бачылі адлюстраванне святла рубінавых звёзд Крэмля. Яны ўсімі мерамі і сродкамі дапамагалі Чырвонай Арміі граміць польскую шляхту.

Чырвоны сцяг Советаў навекі ўзвіўся над вызваленай зямлёй, якая 20 год была ў ярме польскіх паноў.

***

Такія ўрокі гісторыі. І гора таму, хто забудзе аб іх, хто пасмее пасягнуць на нашу вялікую краіну, хто захоча паспрабаваць сілу совецкай зброі.

РАЗГРОМ БЕЛАПОЛЬСКІХ АКУПАНТАЎ

20 год таму назад 11 ліпеня 1920 года гераічная Чырвоная Армія вызваліла сталіцу БССР—Мінск ад белапольскіх акупантаў. Гэтым самым быў пакладзен пачатак слаўнай перамогі беларускага народа над яго векавечнымі ворагамі—польскімі панамі.

Уся гісторыя беларускага народа поўна барацьбы супроць польскіх паноў, барацьбы за сваё з'еднанне, за з'еднанне з вялікім брацкім адзінакроўным рускім народам.

Гісторыя рускага, беларускага і украінскага народаў на ўсім яе працягу неаддзяліма. Ім прыходзілася весці безупынную барацьбу супроць замежных захватчыкаў.

Вайна 1920 года з белапанскай Польшчай яшчэ раз уваскрашае ў нашай памяці гераізм і патрыятызм нашага вялікага народа. Працоўным Беларусі асабліва памятны гэты адзін з найбольш важных этапаў вайны імперыялістаў супроць СССР—нашэсце панскай Польшчы на краіну Советаў.

Польскія паны не ўлічылі ўрокаў мінулага. У 1920 годзе яны зрабілі спробу яшчэ раз захваціць беларускія землі заняволіць беларускі народ.

Што цягнула польскіх паноў на Беларусь? Першае—гэта звярыная нянавісць паноў да совецкай улады—улады рабочых і сялян, жывёльны страх перад гэтай уладай.

Польскія паны да Кастрычніцкай рэволюцыі ўладалі ў Беларусі сотнямі маёнткаў, ім належалі лепшыя землі. Толькі ў адной Мінскай губерні ў князя Радзівіла было каля 200 тысяч дзесяцін зямлі, у графа Тышкевіча—296 тысяч дзесяцін, у графа Патоцкага—240 тысяч дзесяцін. У сваіх захватніцкіх планах польскія паны не абмяжоўваліся толькі зваротам сваіх маёнткаў і зямель. Паны ставілі сабе мэтай захваціць Беларусь і правабярэжную частку Украіны, устанавіць на гэтай тэрыторыі сваю ўладу.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» так характарызуе гэту авантуру белапольскай ваеншчыны:

«У палякаў быў план: захваціць правабярэжную частку Совецкай Украіны, захваціць Совецкую Беларусь, аднавіць у гэтых раёнах уладу польскіх паноў, расшырыць межы польскай дзяржавы «ад мора да мора», ад Данцыга да Одэсы, і за дапамогу, аказваемую ім Врангелем,—дапаматчы Врангелю разбіць Чырвоную Армію і аднавіць у Совецкай Расіі ўладу памешчыкаў і капіталістаў.

Гэты план быў адобраны дзяржавамі Антанты».

Панскай Польшчы за вайну з большэвікамі англа-французскія імперыялісты абяцалі Правабярэжную Украіну і Беларусь, аб якіх даўно марылі польскія памешчыкі.

Беларускія лясы, украінская пшаніца, багацейшыя нетры украінскай і беларускай зямлі—усё гэта ўзбуджала звярыныя апетыты польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Ім ужо здавалася, што і беларускія лясы, і украінская пшаніца, і ўсе багацці з'яўляюцца іх уласнасцю. І толькі варта працягнуць руку, каб іх атрымаць.

Свабодалюбівыя беларускі і украінскі народы за ўяўленні яснавяльможных польскіх паноў былі пакорлівымі рабамі, якіх можна было скаваць ланцугамі нацыянальнага прыгнечання.

Але паны памыліліся.

Беларускі і украінскі народы ў саюзе з вялікім рускім народам падняліся на свяшчэнную вайну супроць сваіх векавечных ворагаў—польскіх паноў.

Па закліку партыі Леніна—Сталіна ў гарадах і сёлах Украіны і Беларусі народ паўстаў супроць захватчыкаў. Мудрыя кіраўнікі партыі большэвікоў і правадыры працоўных Ленін і Сталін збіралі лепшыя сілы для барацьбы з белапалякамі. Палкі і дывізіі ўкамплектоўваліся бясстрашнымі байцамі, якія праславілі сябе ў баях з Юдзенічам, Калчаком і Дзенікіным. З Паўднёвага на польскі фронт была перакінута легендарная Чырвоная конніца, на чале якой стаялі сапраўды народныя героі, таленавітыя палкаводцы Варашылаў і Будзённы.

Палітычнае і ваеннае кіраўніцтва барацьбой з белапалякамі было ўскладзена на таварыша Сталіна.

У гарадах і сёлах Беларусі арганізоўваліся атрады добраахвотнікаў. Партыйныя арганізацыі праводзілі мабілізацыю комуністаў для адпраўкі на фронт. Агульны сход Мінскай партыйнай арганізацыі 27 красавіка 1919 года прыняў пастанову: «Правесці мабілізацыю 50 проц. усіх членаў нашай арганізацыі, кандыдатаў і спачуваючых для неадкладнай адпраўкі на фронт. Астаючыяся 50 проц. праходзяць курс ваеннага абучэння» (газета «Минский пролетарий», № 21, ад 29 красавіка 1919 года).

Беларускі народ не быў адзінокім у сваёй барацьбе з польскімі захватчыкамі. На дапамогу яму прышоў вялікі рускі народ. Яму на дапамогу партыя большэвікоў прыслала вялікага друга беларускага народа таварыша Сталіна і яго блізкіх саратнікаў Серго Орджанікідзе, Міхаіла Іванавіча Калініна. Таварыш Сталін асабіста кіраваў аперацыямі Заходняга фронта супроць белапалякаў. Ён выпрацоўваў стратэгічныя планы VII, XV, XVI армій. Таварыш Сталін згуртоўваў чырвоаармейцаў, камандзіраў, увесь беларускі народ і натхняў яго на рашучую барацьбу супроць замежных захватчыкаў. Таварыш Сталін асабіста кіраваў абаронай Мінска — сталіцы Совецкай Беларусі.

Вялікую дапамогу беларускаму народу ў яго барацьбе супроць польскіх паноў аказаў тав. Орджанікідзе, які быў паслан Цэнтральным Камітэтам большэвіцкай партыі на заходні фронт. Тав. Орджанікідзе, каб спыніць далейшае прасоўванне белапалякаў, рашыў ва што-б та ні стала вызваліць ад белапалякаў горад Барысаў. Ён асабіста ўзначаліў разведку ў гор. Барысаў, устанавіў колькаснасць сіл ворага, а затым павёў рашучае наступленне часцей Чырвонай Арміі, і Барысаў быў узят. Гэта наступленне адыграла выключную ролю ў выкананні геніяльнага сталінскага стратэгічнага плана разгрому белапольскіх акупантаў.

Вялікую дапамогу беларускаму народу аказаў таксама бліжэйшы саратнік Леніна і Сталіна Міхаіл Іванавіч Калінін—былы старшыня ВЦВК РСФСР. На Заходні фронт Міхаіл Іванавіч прыбыў з агітпоездам «Кастрычніцкая рэволюцыя». Тав. Калінін быў на фронце каля месяца. Ён пабываў у Мінску, Віцебску, Оршы, Магілеве, Гомелі, Жлобіне, Бабруйску і іншых гарадах і вёсках—усюды дапамагаў арганізоўваць абарону Беларусі ад польскіх захватчыкаў.

4 ліпеня пад магутным напорам Чырвонай Арміі белапольскія акупанты пачалі адступаць. Чырвоная Армія разам з беларускімі партызанамі нястомна гнала і граміла наглых захватчыкаў. 11 ліпеня 1920 года быў вызвален Мінск. К пачатку жніўня ўся Беларусь была вызвалена ад гнёту панскай Польшчы.

У газеце XVI арміі «Красноармеец» ад 15 ліпеня 1920 года было надрукавана паведамленне таварыша Сталіна. Ён пісаў аб выключна цёплых адносінах беларускіх рабочых і сялян да Чырвонай Арміі:

«Такіх адносін мне не прыходзілася сустракаць ні на ўсходзе, ні на поўдні. Не гледзячы на беднасць сялянскіх мас на Захадзе, у параўнанні з Паваложжам і Поўднем, усё-ж сяляне дзяліліся апошнім з чырвоаармейцамі... Мы прысутнічаем у сучасны момант пры сапраўднай сялянскай рэволюцыі ў Беларусі». (Варашылаў—«Сталін і Чырвоная Армія», стар. 148—149).

З вялікай радасцю працоўныя Беларусі сустракалі сваю вызваліцельніцу—Чырвоную Армію.

Чырвоная Армія падышла да самай Варшавы і Львова. Панская Польшча знаходзілася пад патрозай поўнага разгрому. Але гэтаму перашкодзіла здрадніцкая палітыка ворагаў народа Троцкага і Тухачэўскага, яна выратавала польскіх паноў. Наступленне на Варшаву закончылася няўдачай, і белапалякам у верасні 1920 года зноў удалося захваціць Заходнюю Беларусь.

11 месяцаў белапольскай акупацыі з'яўляюцца самымі цяжкімі дніямі ў жыцці беларускага народа. Польскія захватчыкі грабілі гарады і вёскі Беларусі, чынілі крывавую расправу над рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі. У гарадах і вёсках адбываліся масавыя арышты, да арыштаваных прымяняліся самыя зверскія катаванні.

Следам за белапольскімі акупантамі ў свае маёнткі вярнуліся памешчыкі, а на фабрыкі і заводы—фабрыканты. Пры дапамозе штыка і бізуна памешчыкі і фабрыканты вярталі сваё дабро.

Белапольскія акупанты ўстанавілі ў Беларусі нецярпімы нацыянальны гнёт. Беларускія і рускія школы закрываліся. Праводзілася насільственая паланізацыя беларускага народа. У гарадах і мястэчках белапалякамі былі арганізаваны дзікія яўрэйскія пагромы.

Прыкрываючыся фальшывым нацыянальным беларускім сцягам, контрэволюцыйныя буржуазныя нацыяналісты ўсялякі дапамагалі польскім захватчыкам.

Але партыя Леніна—Сталіна выкрыла гэтых ворагаў народа.

Пасля выгнання белапольскіх захватчыкаў у Беларусі зноў была адноўлена совецкая ўлада. У дэкларацыі ад імені рабочага класа і працоўнага сялянства, выданай 31 ліпеня 1920 года, было абвешчана: «Усе законы і пастановы польскіх акупацыйных улад аб аднаўленмяняюцца... Усё народнае багацце пераходзіць у рукі дзяржаўных органаў рабоча-сялянскага народа».

Пры дапамозе Англіі, Францыі і подлых наймітаў замежных разведак уродлівае дзіцяці Версаля—панская Польшча ўцалела і частка Беларусі асталася пад яе ўладай. 20 год пакутвалі працоўныя масы Заходняй Беларусі пад гнётам польскіх паноў. 20 год яны марылі аб з'еднанні са сваёй бацькаўшчынай. Гэтая мара ажыццявілася. 17 верасня 1939 года гераічная Чырвоная Армія, выконваючы волю совецкага народа, вызваліла нашых адзінакроўных братоў ад іга панскай Польшчы і паклала канец раз'яднанню беларускага народа. Беларускі народ з'еднан у адзіную совецкую дзяржаву. З'еднан у адзіную дзяржаву і вялікі украінскі народ.

Польшча, створаная версальскім дагаворам з ласкутоў розных дзяржаў, разглядалася англа-французскімі імперыялістамі як плацдарм для вайны супроць нашай радзімы. Панская Польшча ўсяляк прабавала выслужыцца перад англа-французскімі імперыялістамі і апраўдаць сваё буфернае становішча. Але не апраўдала. У верасні 1939 г. панская Польшча перастала існаваць.

Уладзімір Ільіч Ленін, гаворачы аб авантурыстах, якія зацеялі вайну Польшчы супроць Совецкай Расіі, указваў, што «... мы павінны адвучыць так, каб яны дзецям, унукам і праўнукам сваім заказалі гэтай штукі не рабіць...»

Выгнаўшы польскіх захватчыкаў, беларускі народ у цесным саюзе з усімі брацкімі народамі Совецкай краіны прыступіў да мірнага соцыялістычнага будаўніцтва.

За гэтыя 20 год Совецкая Беларусь у брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўзняла сваю эканоміку і культуру і разам з усімі народамі Совецкага Саюза паспяхова будуе соцыялістычнае грамадства. З'еднаны беларускі народ пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна ідзе да ззяючых вяршынь комунізма.

Т. ЦІМОХАЎ.

СЕРГО ПАД БАРЫСАВАМ

— Прыяміна! — гучна аб'яўляе праваднік, праходзячы па вагону.

Поезд спыняецца на момант, пакідае яру-другую пасажыраў і, абудзіўшы зычным свістком ваколіцу, імчыцца далей, праразаючы палі, пералескі, узгоркі.

Станцыя нічым не адрозніваецца ад іншых палявых станцый. Такая-ж густая купка ліп і бяроз акаймляе станцыйныя будынкі. Такія-ж лавачкі з размытай дажджамі фарбай туляцца ля нізенькага плота. Такая-ж цішыня пануе тут ад поезда да поезда.

Але мясцовым жыхарам станцыя расказвае многае. З ёю і з горадам, размешчаным за дваццаць кілометраў на паўдзённы захад, звязан адзін з подвігаў Серго Орджанікідзе — любімца партыі бальшэвікоў, баявога саратніка Сталіна, чалавека вялікага сэрца і невычарпальнай мужнасці.

Быў канец лета 1919 года. У такі час бераць-бы ўраджай з палёў, малаціць-бы бажыну, жыць-бы мірнай працай... Але разумольная здань вайны зноў паўстала ад Беларуссю. Нечакана напаўшыя на маладую краіну Саветаў выдатна ўзброеныя і вымуштраваныя белапольскія легіёны пяснілі стомленыя бясконцымі баямі, разрозненыя, слаба яшчэ ўзброеныя часці Чырвонай Арміі.

Белапалякі ўзялі Бабруйск. Паў Мінск. Паў Барысаў. Пусцелі беларускія палі, гарэлі вёскі, стагналі гарады. Так адзначалі свой шлях акупанты.

У адзін з летніх дзён, калі фронт прасунуўся ўжо на паўночны ўсход ад Барысава, на станцыю Прыяміна прыбыў баінскі эшалон. Звычайны эшалон, якіх многа праходзіла ў той час цераз станцыю, — з пашарпанымі класнымі вагонамі і цяплушкамі. З вагонаў даносіліся гавар, смех і песні чырвонаармейцаў, пранутых у што папала, але поўных веры ў будучае.

З прыходам эшалона на станцыі стала жыўлена. Закіпела дружная работа чырвонаармейцаў і сялян з навакольных вёсак. У некалькіх напрамках ад поезда працягнуліся тэлефонныя правады. Крыцьця лініі акопаў і павуцінне калючага дроту загарадзілі подступы да станцыі.

Неўзабаве мясцовыя жыхары ўбачылі галавека, які кіраваў гэтай работай.

Невысокі, плячысты, у простай цўгай цыпелі, у востраканечным шлёме з вялікай пяціканцовай звяздой, ён паяўляўся сюды, дзе трэба было палбалзёрыць, распаралізіцца. Ён выслухоўваў даклады камандзіраў, часта гутарыў з сялянамі, што выходзілі з вёсак, прымаў у сябе людзей, прышоўшых з захвачанага белапалякамі Барысава.

— Серго Орджанікідзе — растлумачыў нехта з чырвонаармейцаў.

— Ад самога Сталіна — далаў друг, — кажуць, з вялікім даручэннем...

Серго прыехаў на станцыю Прыяміна з Смаленска з палявым штабам XVI армії. Ён дапамагаў Сталіну, якога партыя тыя гады пасылала на самыя адказныя фронты рэспублікі, распрацоўваць план тынення наступлення і разгрому белапалякаў. Кіраваць гэтай аперацыяй Сталін даручыў Орджанікідзе.

Горад Барысаў быў тым пунктам, які вырашаў лёс фронта, лёс Беларусі. Белапалякаў неабходна было затрымаць на лініі ракі Беразіны, каб сканцэнтраваць сілы Чырвонай Арміі, падцягнуць рэзервы і абрушыць на ворага бязлітасны удар. Але да прыезду Орджанікідзе становішча на фронце было няясным і непрадпечным.

Барысаў узят белапалякамі. Якія часці занялі яго? Колькасць іх? Як яны ўзброены? Безліч неадказных пытанняў хвалявала Серго і ні па адно з іх не было ад-

казу. Разведчыкі не даходзілі да горада. Весткі паступалі суперэчлівыя, блытаныя. Выдумка ў іх змешвалася са страхам перад зверствамі белапалякаў.

Тады Серго прыняў рашэнне: ў разведку ісці самому — гэта адзіны выхад.

У тую ноч нечакана пайшоў праліўны дождж. Здавалася, неба хацела выліць на зямлю ўсё, што яно накапіла за гарачы засушлівы месяц. Умомант напоўнілася вільгаццю зямля. Захлюпалі засохшыя было за час спёкі балоты. Быстрыя ручаі палялі па каляінах дарог і сцежак.

Побач з Серго ішлі з дзесятак чырвонаармейцаў і некалькі праваднікоў з Барысава. Маленькі ланцужок людзей губляўся ў змроках ночы. Яны мінулі лінію фронта. Пачаліся густыя хмызнякі, балоты, лясы. Нават у звычайны час цяжка было прайсці па гэтай глухамані ноччу. А зараз тым больш — кожны куст можа аказацца ворагам, за кожным дрэвам можа таіцца здрада...

Таемныя ваўчыныя сцежкі, знаёмыя толькі праваднікам, абмінаючы небяспечныя мясціны на балотах і хавалі ад варожых патрулёў, якія рыскалі па ваколіцах. Дзені-дзе на палянах між лесу дымяліся і шыпелі пад дажджом сялянскія хаціны, спаленыя белапалякамі.

Дождж не пераставаў. У прасветах лясного гушчара, нарэшце, замільгалі рэдкія, бледныя аганькі.

— Барысаў, — сказаў адзін з праваднікоў Серго Орджанікідзе.

Яны прайшлі на акраіну горада. Тут, у адной з бедных непрыглядных хацін, што прытуліліся ля скураных заводаў, Серго чакалі прадстаўнікі Барысаўскага падпольнага рэўкома. Што расказалі яны яму?

Некалькі дзён таму назад у Барысаў уварваліся перадавыя часці белапалякаў. Спакойны дагэтуль, маленькі гарадок адразу напоўніўся сенкамі і стогнамі. Белапалякі грамілі магазіны, выносілі з кватэр усё, што можна было вынесці, забівалі хатнюю жывёлу, здзекваліся над тымі, хто хоць словам выражаў свой пратэст.

— Войску дазвана на тры дні воля,— заявіў жыхарам толькі што прызначаны камендант горада.— Хай жаўнеры пазабавяцца крыху...

Жаўнеры забаўляліся па-свойму: рэзалі бароды старыкам, рабавалі кватэры, збівалі жанчын і дзяцей, расстрэльвалі рабочых, западозраных у скачуванні чырвоным. Многа дамоў у горадзе, асабліва на акраіне, былі спалены. Горад паступова пусцеў: рабочыя пайшлі з чырвонымі, многія хаваліся ў лясах і навакольных вёсках...

Праз кароткі час Серго ўжо меў падрабязныя весткі аб становішчы ў горадзе, аб белапольскіх часцях, заняўшых горад. У яго ўжо паспяваў план бліжэйшых дзеянняў. Таму ён у гэтую-ж дажджлівую ноч, не губляючы ні хвіліны, пайшоў са сваім маленькім атрадам назад на станцыю, у свой штаб.

Хуткі зварот разведчыкаў на чале з Серго адзівіў нават бывалых чырвоных камандзіраў і байцоў. Але яшчэ больш здзівіліся яны, калі Серго, не адпачыўшы, загадаў часцям арміі неадкладна рыхтавацца ў наступленне на Барысаў.

Спешна напаўняліся палкі і батальёны, парадзеўшыя за час апошніх баёў. У вагоне Серго камандзіры атрымлівалі інструкцыі. Збіраліся партызанскія атрады ў лясах, каб ударыць ворагу ў тыл. Усёй падрыхтоўкай, кожнай дэталлю яе Серго кіраваў сам. І праз дзень пасля разведкі часці XVI арміі рушылі ад Прыяміна на паўднёвы захад — на Барысаў.

Белапалякі не чакалі гэтага ўдару. Упэўненыя ў тым, што Чырвоная Армія не тая хутка збярэ свае сілы пасля першых паражэнняў, яны былі засцігнуты знянацку. Выяўляючы сваю бяссільную злобу на горадзе, падпальваючы дамы, знішчаючы ўсё на сваім шляху, яны беглі за Беразіну, каб хоць на невялікі час замацавацца за ракой.

Так белапалякі атрымалі першы ўрок. Далейшае іх прасоўванне было спынена. Фронт на некалькі месяцаў замацаваўся на лініі ракі Беразіна. Маладая рэспубліка тымчасам накапляла сілы, папаўняла і ўмацоўвала часці Чырвонай Арміі, каб у чэрвені і ліпені 1920 года нанесці магутны, сакрушальны ўдар белапольскім легіёнам.

У гэтым разгроме белапалякаў, у вызваленні белапольскай зямлі ад панскай няволі ёсць вялікая доля працы і энергіі Серго Орджанікідзе.

Таму, праязджаючы міма невялікай чыгуначнай станцыі Прыяміна, кожны, знаёмы з гісторыяй нашай радзімы, успамінае Серго. Крыштальна чысты, благародны вобраз яго акружан у народзе бязмернай любоўю і пашанай.

Аб ім, як аб баявым саратніку Сталіна, і аб яго подвігах складае вольны народ песні і легенды, поўныя шчырасці і любві.

Тар. ХАДЖЕВІЧ.

«Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі». Карціна мастака М. І. Манасзона.

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

ТАПОЛЯ

(Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў)

На паляне, на прыволлі
Дзень і ноч шуміць таполя.
І, здаецца, кажа казкі, —
Можа травам, можа краскам?

Можа колас ціхі ў полі
Думы ведае таполі?
Вецер мне шапнуў на вуха:
— Прыхадзі ўначы, паслухай.

І стаю
я на прыволлі
Ля высокае таполі.
Загудзела верхавіна...
Будзе казка, ці быліна?

— Будзе казка і быліна!
Кажа кожная галіна
І звініць мне срэбрам лісце:
— Я спявала тут калісьці

Песню хлопцам-партызанам,
Песню воінам адданым.
Ночкай цёмнаю хавала
Я сыночкаў ад навалы.

А як зорка гасла ў небе, —
Я шаптала:
— У путь вам трэба,
Каб ад панскай ягамосці
Засталіся толькі косці!

Уставалі партызаны, —
Кожны ў песню закаханы:
— Будзе воля,
будзе доля!
Ну, пакуль, мая таполя.

Я чакала.
Смуткавала.
Дзён спакойных я не знала.
Прыляцелі ветры з поля:
— Ёсць і шчасце,
ёсць і доля!

І расту я на паляне.
Сэрца цепыцца, як гляне —
На азёры,
на прасторы,
На лясоў зялёных горы.

Снее жыта і пшаніца,
Лён ласкава залаціцца.
Пахнуць яблыні і сосны,
І сады звіняць пад восень.

Гляну ў неба —
раным-рана
Мчацца дзеці партызанаў.
Мне-б сказаць, каб чулі:
— Дзеці,
Недарма жыву на свеце!

КВІТНЕЕ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Новае жыццё! Гэтыя словы на вызваленай зямлі становяцца з кожным днём усё больш адчувальнымі. Парасткі новага моцна ўвайшлі ва ўсе поры жыцця края. Палессе з яго вядомымі пінскімі балотамі змяняе свой выгляд. Абнаўляюцца гарады, сёлы і вёскі. На ўсходнім схіле Днепра-Бугскага канала ўжо ідуць судны, заканчваюцца адзелачныя работы на гідравузлах. Яны прыбіраюцца ў кветкі і прымаюць святочны выгляд.

— Дзеці шча совецкай улады,—так гаворыць сялянін аб Днепра-Бугскім канале. І сапраўды Днепра-Бугскі канал ужо ва многім змяніў аблічча Палесся. Ажылі раней непраходныя глыбінныя месцы. Гудкі параходаў нарушылі векавую цішыню.

Па дарозе ад Пінска да Лагішына можна ўбачыць дзесяткі сотень сялян і сялянак, юнакоў і дзяўчат, якія скарасным метадамі будуюць дарогу Пінск—Лагішына — Цэліханы. Знікае палескае бездарожжа. Рукамі працоўных пракладваюцца новыя дарогі. Абласны цэнтр будзе злучан з глыбіннымі раёнамі.

На ўсіх скарасцях працуюць абноўленыя і рэканструіраваныя фабрыкі і заводы. Прайдзіцеся па цэхах запалкавай фабрыкі імені 17 верасня. Яна пабудавана вядомым шведскім запалкавым каралём Крыгерам. Раней тут працавала 240 рабочых некалькі дзён у тыдзень, цяпер прадпрыемства не пазнаць, на ім працуюць 940 чалавек. На фабрыцы паявіліся дзіцячыя яслі, школа па ліквідацыі непісьменнасці, бібліятэка — установы, аб якіх не ведаюць на капіталістычных прадпрыемствах. Заканчваецца будаўніцтва дзіцячага сада. Рабочыя тт. Расюк, Касоўскі і іншыя атрымліваюць у гэтым годзе пуцёўкі на курорты і дамы адпачынку.

Так скрозь і ўсюды — у цэхах і ва ўстановах, на полі і ў школе, у магазіне і ў паліклініцы адчуваюцца першыя магутныя парасткі новага соцыялістычнага жыцця, радаснага і шчаслівага.

У барацьбе за будаўніцтва новага светлага жыцця вырас новы чалавек з новымі якасцямі і ідэаламі. Хто не ведае ў абласці старога фанерпчыка тав. Калодзішча, начальніка цэха фанернага завода № 4, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР? Умела, па-гаспадарску арганізоўваючы работу ў цэху, ён у той-жа час вырашае важныя дзяржаўныя пытанні. Да яго патокам ідуць пісьмы выбаршчыкаў.

Хто ў Пінску не ведае Хаю Боім і Сару Дрыжун, работніц запалкавай фабрыкі, якія перайшлі на многастаночнае абслугоўванне. Хая Боім, працуючы на трох станках, дае за змену 199 тыс. каробак запалак, а Сара Дрыжун — 197 тыс. каробак.

Вызвалены ад капіталістычных пут народ праяўляе вялікія творчыя здольнасці. На прадпрыемствах шырока разгарнуўся рацыяналізатарскі рух і вынаходніцтва. На мікашевіцкім фанерным заводзе рэалізавана 13 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць эканомію ў 136 тысяч рублёў. У перыяд капітальнага рамонту тут было рэалізавана 8 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць звыш 400 тыс. рублёў эканоміі. Электраманцёр гэтага завода тав. Васілеўскі прапанаваў павялічыць колькасць абаротаў лушчыльнага станка № 5, што павялічвае прадукцыйнасць працы на 15 проц.

Начальнік каробачнага цэха запалкавай фабрыкі імені 17-га верасня тав. Музыкін вынайшаў прыстасаванне для размоткі папяровай ленты на станку, механік аўтаматычнага цэха тав. Вінк прапанаваў змяніць латуневыя пазуўнкі стальнымі ролікамі.

Народ, які 20 год стагнаў пад гнётам польскіх акупантаў, цяпер пазнаў радасць соцыялістычнай працы. Ён гатоў на новыя вялікія подвігі.

Б. ЗНАМЕНСКІ.

г. Пінск.

ПЕСНІ БАЯВЫХ ЧАСОЎ

Серабрыліся шашкі, хрусцелі косці, коні ўздымаліся на дыбы, групамі прыбягалі без коннікаў. І было відаць, як узнімаўся жоўты пыл і асядаў на акрываўленыя травы. Серабрысты трызвон шашак паступова заціхаў, і тады чырвоныя воіны, байцы атрада Несцяровіча, спявалі. Песня падхватвалася ветрам, перакідвалася за зялёную дубраву.

«Земля всегда
была полна
убийства и
вражды,
По звездам
указывала она
Кровавые следы.
Лилася кровь
в ее лесах,
Кропила все
поля.
В кровавых
билася слезах
Страдалица-
земля».

І песня расла, узнімалася, а Несцяровіч ехаў ля берага і як сонечны промень палымнела яго шашка.

— Сячы, хлопцы, панскую косць! Дасякай белую гадзіну!

***

Атрадам партызан кіраваў селянін Бучук. Белапольскія банды былі ўзброены кулямётамі і гарматамі. Люты быў бой. Партызаны трымаліся да канца, да апошняга патрона. Яны ішлі на варожы стан з песнямі.

«Против общих злых вампиров,
Против шайки панов и господ —
Встаньте все, пролетарии мира,
Обездоленный, черный народ.
Встань, рыцарь нового строя,
Встань, песня великая наша.
До последнего кровавого боя
Трудовые сомкайте ряды».

З песнямі, як і з гарматамі, воіны ішлі ў бой і перамагалі. Многа песень з тых незабыўных баявых дзён захавалася ў архіве ў горадзе Магілеве.

Аб незадачлівых польскіх ваяках была складзена песня «Белапольшча».

«А, пан паляк, —
Панталоны скінь і ляг;
Лепш пану ляжаць ў пасцельцы,
Чым ў грабу ў зямельцы.
Наступленне павядзем —
У проб мгнавенна пападзем».

Гэтыя песні нагадваюць успаміны пра тыя дні — дні пажараў, барацьбы і перамог. Перад намі жыва вырысоўваюцца атрады чырвоных байцоў, якія з песнямі перамогі на ўзмыленых конях ляцелі на варожы стан, шашкамі рубілі белапольскіх генераляў, золатапагоннікаў.

А. БЯЛЕВІЧ.

Магілеў.

Цім. ЗАРЭЧНЫ

АНДРЭЙ БЛАЖКО

(Урывак з аповесці)

— Суд ідзе, прашу ўстаць!

Традыцыйнага «прашу ўстаць» можна было і не гаварыць: людзі і без таго сталі. Па народу прайшло трапятанне. Збянтэжанасць знікла. Небяспека, як электрычная хваля, злучыла, з'яднала людзей адно пэлае.

Голас у палкоўніка быў глухі і грубы. Ён пералічваў злачынствы, у якіх абвінавачваюцца палсудныя: удзел у партызанскім атрадзе, перарэзванне тэлеграфных правадоў, разбурэнне чыгуначнай лініі, скідванне трох паязноў, напад на абозы, забойства польскіх салдат і афіцэраў.

Першымі былі названы людзі, якіх прадстаяла вызваліць «з-за недаказанасці», як кваліфікаваў суд. Другімі ішлі людзі, асуджаныя на катаргу,—па чатыры, па пяцёх, па восем і дванаццаць год.

Апошнімі ішлі асуджаныя на смерць. Іх было дваццаць сем чалавек. Андрэй Блажко ішоў першым. Усе—у росквіце маладосці і сілы.

Да іх прывялі ксяндза. Паручык Мілошын запытаў:

— Спавядацца будзеце?

— Не, — адказала некалькі галасоў.

Тады прывялі папа Шыманоўскага.

— Спавядацца будзеце?

— Не, — зноў адказала некалькі галасоў.

Асуджаных на смерць акружылі канваіры. Паручык Мілошын пачаў правяраць кайданы. Яны звінелі. Паручык, стараючыся быць падобным да палкоўніка, праказаў:

— Вось і музыка... аркестр кайданаў.

Смертнікі, цяжка дыхаючы, маўчалі. Адзін за адным яны падымалі рукі, паручык палыхозіў і правяраў кайданы.

— Можна весці... у парадку.

Тады перад судом выступіў Кірэня:

— Паважаныя паны суддзі! — сказаў ён. — Суд фармальна скончыўся. Я не магу па закону звяртацца да суда з просьбай перагледзець яго пастанову. Але тут, паны суддзі, выключныя абставіны. Я канстатую, паны суддзі, што частка асуджана няправільна, не па закону. Нам не патрэбен увесь статак, — усклікнуў Кірэня, — нам трэба знайсці пастыра і яго памочнікаў! Я прашу суд перагледзець пастанову...

Эдзіўленыя партызаны, не разумеючы, у чым справа, стаялі і глядзелі. У іх загарэліся пробліскі надзеі. А можа нікога не расстраляюць? Можа ўсіх вызваляць? Партызаны не ведалі, што ўвесь гэты суд быў толькі містыфікацыяй: ён ставіў перад сабою правакатарскую мэту — прымусіць партызан здрадзіць адзін аднаму, выдаць сваіх таварышоў. Сапраўдны суд будзе пасля, яго правядзе ў сваім кабінеце палкоўнік Шэмет сам, адзін на адзін...

Палкоўнік пашпацтаўся з членамі суда, яны, у знак згоды, паківалі галовамі. Палкоўнік падняўся і сказаў:

— Суд згодзен з абаронцай Кірэняй. Справу разгледзім па пратаколах. Калі хто-небудзь з падсудных хоча дапоўніць паказанні, дапаўняйце. Гэта будзе мець выключнае значэнне. Можа здарыцца, так, што той, хто асуджаны на расстрэл, будзе апраўдан. Да вас прыйдзе паручык Мілошын, і ён вашы паказанні запіша.

Тут толькі ўсе партызаны здагадаліся пра сапраўдную цану Кірэневай «абароны» і пра сапраўдныя мэты гэтага правакатарскага суда.

План «абаронцы» праваліўся ў гэтую-ж ноч. Ніхто з партызан не выдаў сваіх таварышоў. Разлаваны палкоўнік загадаў паручыку Мілошыну падрыхтавацца да расстрэлу партызан.

...Усю ноч з 16-га на 17-е мая ў лесе за Харавічамі дваццаць чалавек, прыгнаныя жаўнерамі з мястэчка, капалі яму.

Яму выкапалі глыбокую і шырокую. Стоячы на яе краі, людзі маўчалі. Хто будзе пахаван у ёй?

...Чатыры гадзіны раніцы.

На панскім дварэ строяць у шарэнгу людзей. Іх семдзесят чатыры чалавекі. Некалькі з іх апраўданы. Дваццаць сем прытавараны да расстрэлу. Астатнія асуджаны на катаргу.

Людзі чакаюць новага прысуду. З асуджаных на расстрэл мала хто верыць у вызваленне.

Палкоўнік Шэмет пачынае чытаць прыгавор. Зноў пералічваюцца злачынствы. Зноў першымі ідуць тыя, каму дасца вызваленне. Лік іх павялічваецца. Частка асуджаных на катаргу пераходзіць у спісак вызваленых, частка асуджаных на расстрэл пераходзіць у спісак катаржнікаў. Катаржнікі, быўшыя нядаўна смертнікамі, радуюцца. Яны вернуцца да жыцця. Для іх узыйдзе сонца, для іх плывуць белыя хмары, для іх зелянее сад. Але радасць толькі ў сэрцы. Твары шэрыя, скамянелыя. Калі глядзіш на іх, нельга адрозніць, хто смертнік, хто катаржнік, а хто вызвалены. Усе ненавідзяць афіцэраў, усе хаваюць свае пачуцці, гавораць толькі вочы, сцятыя зубы і кулакі, апушчаныя ўніз.

Па гэтаму — новаму — прыгавору дванаццаць чалавек асуджаюцца на катаргу, на восем і дванаццаць год (пяцера з дванаццаці загінуць у польскіх турмах, астатнія будуць абменены); адзінаццацьжа чалавек: Блажко Андрэй, Крывашчокі Андрэй, Ахрамовіч Андрэй, Рудовіч Міхась, Катлянік Юрый, Камлюк Сцяпан, Камлюк Янка, Камлюк Ілья, Позняк Паўлюк, Буры Пятро, Маліноўскі Максім асуджаюцца на расстрэл.

Прыгавор ваенна-палявога суда канчатковы, абскарджанню не падлягае; выканне яго прызначана ў гэтую-ж раніцу.

Асуджаныя на расстрэл прыгавор выслухалі моўчкі. Ім прапанавалі спавядацца. Яны адмовіліся. Яны папрасілі пабачыцца з раднёй. Палкоўнік Шэмет адмовіў:

— Бывайце, таварышы! — прагаварыў, звяртаючыся да катаржнікаў і вызваленых, Андрэй.

— Бывай, брат! — адказала некалькі галасоў.

Гаварыць Андрэю не далі. Асуджаных на расстрэл абкружылі ўланы, і смертнікі пайшлі, звонячы кайданамі, на дарогу.

Яны былі звязаны папарна: адзін за правую руку, другі за левую нагу. Андрэю нехапіла пары. У яго былі закутыя рукі. Ён ішоў, кульгаючы, адзін наперадзе смертнікаў.

Вакол іх скакалі ўланы. Яны былі з бакоў, ззаду, наперадзе. За імі бег народ: бацькі, браты, сёстры, дзеці асуджаных. Яны плакалі і крычалі. Яны стараліся прарвацца да асуджаных. Коннікі даганялі іх і білі.

Двое дзяцей, хлапчук і дзяўчынка, — хлапчуку было годы чатыры, дзяўчынцы — год шэсць, — падбеглі да асуджаных, учапіліся за бацьку, закрычалі:

— Татачка, вярніся!

— Я зараз вярнуся, — адказаў бацька. — Я толькі ў лес сыджу, я прыду. Ён нёс на руках пінжак. Калі закоўвалі яго ў кайданы, ён быў у адной сарочцы, пінжаком ён накрываўся. Зараз ён нёс яго на руках.

— Наце, нясіце матцы, — падаў ён дзецям пінжак, — я зараз прыду.

Узрадаваныя дзеці пабеглі да мацеры. Яна плакала. Яны аддалі ёй пінжак і сказалі:

— Ён вернецца! Ён прыдзе!

— Не прыдзе, дзеткі! — усклікнула маці.

— А як-жа ён пойдзе ў адной сарочцы?

Маці плакала. Яна бегла, спатыкалася; праз некалькі хвілін яна ўбачыла, што згубіла пінжак, але ўсё бегла, бегла...

Побач з ёю беглі Варбара і Наста, яны таксама плакалі і крычалі. Барбару дагнаў улан і ўдарыў бізуном па твару. Паваліўшыся, яна пачала хапаць камякі зямлі і кідаць у ўлана. Яе падняла Наста. Яна сказала:

— Не плач, мама. Мы адпомсцім. Не буду жыва, калі не адпомшчу за гэта!

Барбара скрозь слёзы бачыла гнеўны Насцін твар, яе сцятыя губы, палаючыя вочы.

Андрэй не бачыў маці. Ён ішоў, кульгаючы, наперадзе смертнікаў, і перад ім паўставалі малюнкі дзяцінства. Успаміналася, як ён пасвіў авечак, і была вялікая навальніца, і воўк зарэзаў ягня... Вось яны ўдвух з Настай скачуць па Высачанскім лузе, коні фыркаюць і ржуць, у вочы б'е вецер... А вось ён стаіць на зборным пункце, у Ігумені, яго вымяраюць і ўзважваюць... У вагонах душна, іграе гармонік, хлопцы спяваюць песню, шырыпа і вырастае мора, сярод мора—карабль, страляюць гарматы... Спарады бухаюць, далёка ў моры падымаецца слуп вады, пахне порахам і соллю... Потым ён ляжыць у акопе, ляжыць і страляе, а белыя наступаюць, ідуць урассыпную, ён страляе па іх, яны падаюць, перакульваюцца...

...Вось і ўскрай лесу, сушроць лесніковай хаты, дзе яго чакала Наста і дзе яго ашукаў правакатар. У маленстве ён хадзіў сюды збіраць ягады і грыбы. Ягады і грыбы адбіралі панскія стражнікі, ён іх дражніў і ненавідзеў. На выгане, каля лесу, ён пасвіў жывёлу. Там стаіць бяроза. З галін яе ён рабіў гутарэлі, раскачваўся, гойдаўся, падскакваў пад макушкі ёлак.

Які багаты і разнастайны свет! Ён не думаў пра гэта раней, не заўважаў гэтага, не бачыў яркага сонца, высокага блакітнага неба, белых, з пушыстымі краямі, хмар, гэтай калючай да болю ў вачах зеляніны, ахапіўшай усю зямлю. Зараз у яго адбяруць усё гэта, адбяруць шырокае поле, лес, у якім знаёмы кожны куст, неба, ідучае ў бяскрайнасць, сонца, заліўшае святлом увесь прастор, і гэтую травінку, што трапіла пад ногі...

Яму не верыцца, што яго заб'юць. Вось яго рука, жылістая і цэпкая. Вось яго ногі, паспеўшыя выхадзіць тысячы вёрст, маладыя, пругкія ногі. Вось яго грудзі, з-за якіх яго аддалі ў матросы, моцныя, прасторныя, дужыя грудзі. На плячах у яго галава, якую ён з гордасцю насіў дваццаць пяць год, галава, якая прымае ўвесь гэты свет, радуецца яму і прывітае яго, — хіба яна пакоціцца па зямлі? А сэрца, гэтае трапяткое, напоўненае жывой гарачай крывёю, хіба яно перастане жыць і любіць?

Яма глыбокая і шырокая. Асуджаных ставяць на край. Палкоўнік Шэмет зноў чытае прыгавор. Потым адыходзіць. Лязгаюць вінтоўкі. Свеціць сонца. На асінніку трашчуць лісты. Потым б'е гром... Як гэта можа гром? Пагода ясная, неба чыстае. Гром... Навальніца... Бліскае маланка... Вые вецер. Па зямлі, як па бубну, б'е град. Загіне пасеў! Прападзе ячмень, пшаніца, жыта. Зноў гром. У зямлі — вялізная чорная шчыліна. Гэта —ад маланкі. Бура падхоплівае і гоніць у шчыліну. Бліжэй, бліжэй... Гэта і ёсць смерць? Шчыліна закрываецца, засасваецца, надыходзіць цемра.

...Калі дваццаць чалавек выводзяць з лесніковай хаты, куды іх загналі на час расстрэлу, ім не дазваляюць заглядаць у яму.

Закапваюць яны моўчкі, ахопленыя страхам. Але страх не задушыў нянавісці. Яны ненавідзяць афіцэра Мілошына, які стаіць за іх спінамі, ненавідзяць палкоўніка Шэмета, які паскакаў адгэтуль на белым жарабку, ненавідзяць увесь гэты дзікунскі, поўны нянрызні да працоўнага чалавека, лад. Дваццаць чалавек, дагэтуль ціхія жыхары мястэчка Дукора, робяцца бунтарамі: калі будзе падаць гэты лад, яны падніхнуць яго у бездань, каб ён не вярнуўся, а самі лёгка ўздыхнуць, вызваленыя з-пад прыгнёту

ВЫСТАЎКА „20 ГОД ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ“

Гэта выстаўка адкрыта ў мінскім парку культуры і адпачынку імені Горкага. На вялікіх шчытах змешчаны фотаілюстрацыі і копіі дакументаў, ярка адлюстроўваючыя гісторыю гераічнай барацьбы беларускага народа за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

Многа разоў падымаўся беларускі народ на барацьбу супроць прыгнятальнікаў. Вось фотакопія справы камісарскага суда аб забойстве паўстаўшымі віцебчанамі (1623 год) архіепіскапа Кунцэвіча. На фотакопіях карцін мастака Геда запечатлёна паўстанне Налівайкі ў Магілеве і паўстанне сялян у Крычаве. Буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя 1905 года выклікала рэволюцыйны ўздым народных мас Беларусі. Выступленні беларускіх сялян супроць паноў адлюстроўвае фотакопія карціны «Разгром маёнтка ў 1906 годзе». Сярод прадстаўленых экспанатаў — паведамленне начальніка дэпартамента паліцыі ад 4 красавіка 1913 года начальніку Магілеўскага жандармскага ўпраўлення аб сувязі ленінскага ЦК РСДРП з гомельскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй. Гэты дакумент сведчыць аб тым, што актыўная дзейнасць сацыял-дэмакратычных арганізацый на Беларусі стала надзвычай адчувальнай для самадзяржаўя.

... На фотаздымках — пасланцы Ленінскага ЦК, кіраўнікі рэволюцыйнага перавароту 1917 года на Беларусі тт. Кагановіч, Фрунзе, Мануільскі, Мяснікоў, Менжынскі.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць вытрымкі з рашэнняў першага з'езда КП(б)Б (снежань 1918 г.) аб стварэнні БССР, Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта аб прызнанні незалежнасці БССР і вытрымка з выступлення тав. Свердлова на I Усебеларускім з'езде Саветаў.

На незалежнасць беларускага народа пасягае панская Польшча. Кіраваць ваеннымі аперацыямі супроць польскіх паноў тав. Ленін пасылае вялікага Сталіна. На фотаздымках, побач з геніяльным стратэгам пролетарскай рэволюцыі таварышам Сталіным, пролетарскія палкаводцы тт. Варашылаў, Орджанікідзе, Будзённы, Пархоменка, якія арганізавалі разгром белапольскіх акупантаў.

У ліпені 1920 года белапалякі пад напорам гераічнай Чырвонай Арміі ачышчаюць сталіцу Беларусі — Мінск. На карціне «Уступленне часцей Чырвонай Арміі ў Мінск» ярка адлюстравана радасная сустрэча вызваленых мінчан з чырвонымі воінамі.

Многія экспанаты дэманстрыруюць росквіт эканомікі, народнай гаспадаркі і нацыянальнай культуры Беларусі за гады сталінскіх пяцігодак.

... Пад прыгнётам панскай Польшчы асталася Заходняя Беларусь. Акварэль мастака Гутмана «У кардэры турмы панскай Польшчы», прывезеныя з гродненскай турмы кайданы і гумавыя дубінкі адлюстроўваюць невыносныя здзекі, якім падвяргаліся палітычныя зняволеныя ў панскай Польшчы. Але ніякія фізічныя ўздзеянні не маглі зламаць рэволюцыйнай волі і духу працоўных. Нелегальна распаўсюджваюцца рэволюцыйныя пракламацыі, лозунгі, літаратура. У гэтых дакументах гучыць заклік да барацьбы за вызваленне (брашура «Прэч рукі ад нашай зямлі!»), выказваецца цвёрдая вера у канчатковую перамогу.

На вялікім шчыце—вытрымка з прамовы тав. Молатава па радыё 17 верасня мінулага года аб брацкай дапамозе працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Шматлікія фотаілюстрацыі паказваюць радасную сустрэчу вызваленых братоў з байцамі Чырвонай Арміі. На карціне Давідовіча і Ціхановіча запечатлёна пасяжэнне Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, узнёшага чырвоны сцяг Саветаў над вызваленымі тэрыторыямі.

Сярод прадстаўленых экспанатаў — пастановы Вярхоўных Саветаў СССР і БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў саставу СССР і БССР, аб з'яднанні беларускага народа.

А. АСТАПЕНКА.

НОВАЯ АЛЕЯ ДА ПАРКА ІМЕНІ ГОРКАГА

Закончаны работы па пракладцы асфальтавай алеі ад рога вуліц Карла Маркса і Чырвонаармейскай да парка імені Горкага. Тут укладзена звыш 50 гранітных ступенек. Па абодвух баках алеі, у 66 жалезабетонных паглыбленнях пасаджана каля 180 тысяч летніх кветак, 4 лаўравыя дрэвы і іншая зеляніна.

На ступеньчатых жалезабетонных тумбах алеі будуць устаноўлены кветкавыя вазы і скульптуры на абаронныя, спартыўныя і калгасныя тэмы.

У бліжэйшы час будзе праведзена рэканструкцыя асвятлення алеі. Устанаўляюцца архітэктурна-аформленыя металічныя асвятляльныя калонкі.

100 ПУНКТАЎ ПА ЛЯЧЭННЮ ТРАХОМЫ

Трахома — адна з многіх сацыяльных хвароб, пакінутых нам у спадчыну панскай Польшчай у заходніх абласцях Беларусі. Хвароба гэта больш за ўсё лютавала ў вёсках Вілейскай вобласці.

Наркамат аховы здароўя паслаў па паўтара-два месяцы ў Вілейскую, Беластоцкую і Брэсцкую вобласці ўрачоў-спецыялістаў па вочных хваробах, якія павінны аказаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу хворым трахомай, а таксама арганізаваць процітрахомныя пункты і падабраць медыцынскія кадры для іх. У заходніх абласцях да канца года будуць адкрыты 100 пунктаў, з іх у Вілейскай вобласці—40, Беластоцкай—20, Баранавіцкай — 20, Брэсцкай — 10, і ў Пінскай вобласці—10 пунктаў.

На Усебеларускай алімпіядзе дзіцячай творчасці. На здымку: выступленне харагода 14-й школы г. Беластока. Фото В. Грунтфеста.

ЗАГАТОЎКА ГАЛІНКАВЫХ КАРМОЎ

ГОМЕЛЬ. Калгасы «XII Кастрычнік» і «Чырвоны авангард», Лоеўскага раёна, пачалі загатоўку галінкавых кармоў. Сабранае лісце і маладыя парасткі дрэў высушваюцца і складваюцца ў гумны. Калгас «XII Кастрычнік» загатовіў ужо 200 тон галінкавага корму, «Чырвоны авангард» — 40 тон. (БЕЛТА).

Рэстаўрацыя аўтатрактарных свеч

У сямі машынатрактарных майстэрнях рэспублікі арганізуецца рамонт і рэстаўрацыя аўтатрактарных свеч. Рамонт і рэстаўрацыя будзе праводзіцца ў Магілеўскай, Слуцкай, Гомельскай, Віцебскай, Аршанскай, Даманавіцкай і Мінскай МТМ. Рэспубліканская кантора Галоўаўтатрактаразбыт арганізуе збор карпусоў, ніпеляў і стрыжняў запальных свеч і забяспечвае аўтатрактарныя гаспадаркі новымі запальнымі свечамі ў абмен на старыя. (БЕЛТА).

Летні адпачынак чыгуначнікаў

Сотні работнікаў Мінскага чыгуначнага вузла і іх дзяцей пабываюць у гэтым годзе ў санаторыях, дамах адпачынку і ў піонерскіх лагерах.

За першае паўгоддзе бягучага года ў санаторыях і на курортах правялі свой адпачынак 88 чыгуначнікаў і 17 дзяцей. У дамах адпачынку за гэты час пабывала 289 чыгуначнікаў і ў летніх піонерлагерах—175 дзяцей.

УСПАМІНЫ УДЗЕЛЬНІКАЎ ВЫЗВАЛЕНЧАГА ПАХОДУ

БАВА. У Н-скай часці ўрачыста адзначаюць 20-годдзе вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Чырвонаармейцы і камандзіры — таджыкі, азербайджанцы, украінцы, рускія — з аднолькавай цікавасцю знаёмяцца з гераічным мінулым беларускага народа.

У часці праводзяцца гутаркі аб разгроме белапалякаў у 1920 годзе, аб пышным росквіце Совецкай Беларусі — малутнага фарпоста на заходніх рубяжах СССР. Лекцыі і даклады чытаюць найбольш кваліфікаваныя прапагандысты часці тт. Дзеў, Краўчанка, Супрын, Літвін, Аляксееў і іншыя.

Удзельнікі вызваленчага паходу ў Заходняй Беларусі праводзяць гутаркі-ўспаміны аб баях за вызваленне працоўных заходніх абласцей БССР. (БЕЛТА).

Перасяленцы ў Карэла-Фінскую ССР

3.147 сямей калгаснікаў Беларусі выказалі жаданне перасяліцца ў Карэла-Фінскую ССР. У сваіх заявах калгаснікі пішуць аб жаданні ператварыць малазаселеныя куткі Совецкага Саюза ў квітнеючыя раёны, перанесці туды багаты вопыт стаханаўскай працы.

Гэтымі днямі ў Карэла-Фінскую рэспубліку выязджаюць першыя перасяленцы — 45 сямей з калгасаў Бабруйскага раёна. 19 ліпеня туды-ж адправіцца эшалон калгаснікаў-перасяленцаў з Віцебскай вобласці.

Новая перамога дынамаўцаў

Учора на мінскім стадыёне «Дынамо» імені Кірава адбыўся чарговы футбольны матч паказальных каманд на першынства СССР па другой групе. Гаспадары поля сустрэліся з камандай «Буревестник» (Масква).

Ініцыятыва ігры ўвесь першы тайм была ў дынамаўцаў. Аднак доўгі час ім не ўдалося адкрыць рахунак. І толькі на 32 мінуце гаспадары поля ўбілі масквічам першы гол. Не гледзячы на ўсе намаганні, гасцям не ўдалося даць адказны гол.

У другім тайме дынамаўцы таксама паспяхова трымалі ініцыятыву ігры. Умелай спасованасцю ім удалося правесці ў вароты масквічоў другі мяч. Матч скончыўся з лікам 2:0 у карысць каманды «Дынамо».

Футбольны матч паказаў значнае палепшэнне тэхнікі ігры каманды «Дынамо». Трэба пажадаць, каб у прадстаячых сустрэчах на першынства СССР дынамаўцы яшчэ вышэй узнялі тэхніку і культуру ігры.

СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ КАЛГАСНЫХ КАМАНД

Закончыліся ўсебеларускія стралковыя спаборніцтвы калгасных каманд, прысвечаныя 20-годдзю вызвалення Беларусі ад белапалякаў. У адной толькі Віцебскай вобласці ў іх удзельнічалі 704 стралкі-калгаснікі. Абласное першынства заваявалі каманды калгасаў «Сталінскі шлях», Вагушэўскага раёна, і «Чырвоны спят», Полацкага раёна.

Выдатныя рэзультаты паказаў стралок калгаса «Сталінскі шлях» тав. Вінніка. Ён выбіў 50 ачкоў з 50 магчымых. Стралок калгаса «Чырвоны спят» тав. Вістынаў выбіў 49 ачкоў з 50 магчымых.

У Магілеўскай вобласці ў спаборніцтвах удзельнічала 595 калгаснікаў.

Добрых поспехаў у стралковай падрыхтоўцы дабіліся стралкі-калгаснікі Уздзенскага раёна, Мінскай вобласці. Напрыклад, калгаснікі тт. Новікаўскі і Пукач выбілі па 49 ачкоў з 50 магчымых.

Выкананне плана торфзаводамі

НАРКАМАТА МЯСЦОВАЙ ПАЛІЎНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР ЗА 9 ЛІПЕНЯ (у процантах)

Заводы	Сутачнае задание	Календарнае задание
Асінторф	103,1	90,9
Чырвоны спят	78,9	78,6
Ім. Орджанікідзе	138,4	100,3
Ім. Даумана	124,4	113,0
Дукоры	90,2	102,7
Радзічава	79,3	47,9
Міхнавічы	131,4	119,0
Балбасава	68,7	82,8
Змяёўка	85,1	84,3
Свабода	76,1	77,6
Лукская	104,9	88,2
Татарка	83,6	86,8
Давыдаўка	121,0	91,6
Дубінец	72,5	64,4
Крэмянец	97,6	61,7
«КІМ»	77,2	54,7
Новая Беларусь	87,8	80,3
Хвойны Масток	118,8	108,4
Туголіца	113,5	41,9
Усяго па наркамату	102,5	88,8

ДА ВЕДАМА ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»
ЧАРГОВЫ НУМАР ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» ВЫЙДЗЕ 13 ЛІПЕНЯ.

КУРСЫ ПАЧЫНАЮЧЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У Мінску пры Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР пачалі працаваць меншыя курсы пачынаючых аўтараў.

На курсах займаецца таленавітая моладзь: рускія паэты тт. ... вестраў (Віцебск) і Дзенісенка (Чэрыкаў), пачынаючыя беларускія пісьменнікі ... цоў (Гомель), Рунец і Дудо (Мінск), ... тар трох кніг польскі празаік Равіч, ... рэйскія паэты Бурсштэйн і Бі... (Беласток) і іншыя.

На курсах будзе прачытан цыкл ... цый: «Класікі марксізма-ленінізма ... літаратуры», «Старажытная беларус... літаратура», «Класікі рускай літаратуры», «Сучасная совецкая руская літаратура», «Беларуская літаратура XIX веку», «Класікі заходнееўрапейскай літаратуры». Народны паэт Беларусі Якуб Колас ... чытае лекцыю на тэму «Народны ге... у літаратуры».

Пісьменнікі і паэты БССР тт. Я. ... пала, Я. Колас, М. Лынькоў, З. Бя... і іншыя падзеляцца з пачынаючымі аў... рамі вопытам сваёй творчай работы.

Маладыя пісьменнікі і паэты пабы... юць у тэатрах, музеях і кінатэатрах ... ліцы БССР.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

12 ліпеня ў памяшканні Дома партас... ты будуць праведзены інструкцыйныя ... няткі семінара кіраўнікоў агіткалектыў... і агітатараў прадпрыемстваў і ўста... Сталінскага раёна па пытанню аб ант... рэлігійнай прапагандзе. Пачатак ў 8 г... вечара.

Запрашаюцца сакратары первічных партарганізацый, старшыні фабзаўкамаў і культработнікі арцелей раёна.

ВЫШАЎ З ДРУКУ „БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ“ № 6.

тэарэтычны і палітычны журнал ЦК КП(б)Б

ЗМЕСТ

Зварот ВЦСПС да ўсіх рабочых і работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых, да ўсіх членаў прафесіянальных саюзаў.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў».

Пастанова Совета Народных Камісараў СССР «Аб павышэнні норм выпрацоўкі і зніжэнні расцэнак у сувязі з пераходам на васьмігадзінны рабочы дзень».

Перадавы — Па-большэвіцку выканаць рашэнні XVIII з'езда КП(б) Беларусі.

Дэкада беларускага мастацтва.

П. Панамарэнка — Мастацтва беларускага народа.

ВОПЫТ РАБОТЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

С. Ігаеў — Будуецца новае жыццё.

Н. Кудракоў — За асваенне новых зямель.

К 20-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Ф. Папоў — Барацьба беларускага народа з белапольскімі акупантамі ў 1919 — 1920 гг.

НА МІЖНАРОДНЫЯ ТЭМЫ

М. Драгілеў — Другая імперыялістычная вайна і эканоміка капіталістычных краін.

КАНСУЛЬТАЦЫІ

В. Бадзін — Ленін у Пецербургу—Петраградзе.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

З А Р У Б Я Ж О М

КАМЮНІКЕ АНГЛІЙСКАГА МІНІСТЭРСТВА АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 10 ліпеня. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што 8 ліпеня англійская авіяцыя бамбардыравала скапленні барж у Зволе, Веесне, Татэме і Дэльфтэ (Галандыя). Многа барж патоплена або падпалена. Бамбардыраваны таксама непрыяцельскія судны ў дадзім парту Ольборг, непрыяцельскія аэрадромы ў Суасоне і Дуэ (Францыя), пашкоджаны патрульныя судны працўніка каля дацкага ўзбярэжжа. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы.

У ноч на 9 ліпеня англійскія самалёты бамбардыравалі марскія базы ў Кіле і Вільгельмсгафене. Пашкоджаны докі і падпалены ваенны карабль праціўніка. Новай бамбардыроўцы падверглісь нафтаперагонныя заводы ў Гамбурге і таварныя склады ў Гаме (Германія), а таксама аэрадромы ў Амстэрдаме і Бруселі. Адзін англійскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

Учора англійскія самалёты бамбардыравалі Берген (Нарвегія), дзе падпалілі ваенны склад і пашкодзілі карабль, а таксама скінулі бомбы на аэрадром у Ставангеры. 7 англійскіх самалётаў не вярнуліся на свае базы. У баю над Ставангерам збіт непрыяцельскі самалёт.

Дзеянні германскай авіяцыі

ЛОНДАН, 10 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што сёння германскія самалёты бамбардыравалі адзін з гарадоў у заходняй частцы Англіі, дзе значна пашкоджаны будынкі. Мяркуюць, што ёсць афіяры. Над усходнім узбярэжжам Англіі збіт германскі самалёт. Па дадатковых вестках, пры ўчарашнім налёце непрыяцельскай авіяцыі збіта 9 германскіх самалётаў.

Ваенныя расходы Англіі перавышаюць 7 з палавінай мільёнаў фунтаў стэрлінгаў у дзень

ЛОНДАН, 10 ліпеня. (ТАСС). Міністэрства інфармацыі перадае, што міністр фінансаў Кінгслі Вуд, выступаючы ўчора ў палаце абшчын, прасіў адобрыць асігнаванне 1 мільярда фунтаў стэрлінгаў на ваенныя патрэбы.

Ён заявіў: «Асігнаваныя палатай 13 сакавіка 700 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў амаль поўнасцю зрасходаваны. Ваенныя расходы за апошні месяц перавысілі 7 з палавінай мільёнаў фунтаў стэрлінгаў у дзень. Агульныя расходы Англіі складаюць не менш 9,5 мільёна фунтаў стэрлінгаў у дзень.

Разрыў паміж паступленнем сродкаў і асігнаваннямі за апошні час павялічыўся, у сувязі з чым у бліжэйшы час павінны быць значна павялічаны падатковыя паступленні».

Пасля спрэчак палата абшчын адобрыла дадатковыя асігнаванні 1 мільярда фунтаў стэрлінгаў на ваенныя патрэбы.

Напружанае становішча ў Сірыі

АНКАРА, 9 ліпеня. (ТАСС). Сірыйскі друк прабуе скрыць напружанае становішча ў краіне, аднак факты, якія паплаваюць у газеты, паказваюць сапраўднае становішча рэчаў. Чытачы ў сваіх пісьмах скардзяцца на дарагавізну і спекуляцыю. Асабліва падняліся цэны за апошні месяц. Асобныя тавары паларажэлі амаль па 100 процантаў. Штодзённа друкуюцца распараджэнні вярхоўнага камісара Сірыі аб захаванні цвёрдых цэн на тавары, але гэтыя распараджэнні мала дапамагаюць. Адчуваецца напружанасць з забеспячэннем прадуктамі харчавання. Улады забаранілі экспартаваць харчовыя прадукты, у тым ліку гародніну і фрукты.

У краіне ўзмацняюцца рэпрэсіі супроць нацыянальнага друку. На мінулым тыдні ў Сірыі закрыты тры арабскія газеты «за невыкананне закона аб друку». У Дамаску арыштавана некалькі чалавек за распаўсюджванне «іжлывых вестак». Уладамі выдана распараджэнне, забараняючае язду ноччу на матацыклах і веласіпедах.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПЕРАГАВОРАХ ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І БАЛГАРЫЯЙ

БЕРЛІН, 9 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Трансцэан перадае па радыё паведамленне свайго карэспандэнта з Сафіі, у якім гаворыцца, што, згодна цыркуліруючых там у добра інфармаваных кругах чутках, Грэцыя мае намер уступіць у перагаворы з Балгарыяй адносна існуючых спрэчных пытанняў. Заяўляюць, што Грэцыя звярнулася да Балгарыі з просьбай высунуць канкрэтныя прапановы. Карэспандэнт указвае, што гэтыя чуткі афіцыяльна ў Сафіі яшчэ не пацвярджаюцца.

Загад аб арышце Далад'е

НЬЮ-ЙОРК, 9 ліпеня. (ТАСС). Згодна паведамлення лондонскага карэспандэнта газеты «Чыкаго дэйлі ньюс», добра інфармаваныя кругі заяўляюць, што французскі ўрад аддаў распараджэнне ўладам Французскага Марока арыштаваць Далад'е і Мандэля. Па вестках, Далад'е і Мандэль знаходзяцца на барту парахода «Масілья» ў Касабланка.

Становішча ў Гібралтары

РЫМ, 10 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе, што становішча ў Гібралтары становіцца напружаным. 7 ліпеня англійская зенітная артылерыя нібы збіла французскі гідрасамалёт.

Перад горадам Ла-Лінеа (паблізу Гібралтара) прадаўжаюць капаць траншэі.

Англійскі флот вышаў у мора. Праз поўгадзіны ў Сеуце, Ла-Лінеа і Алхесірасе была чутна моцная кананада. Мяркуюць, што паміж англійскай эскадрай і французскімі караблямі завязаўся бой.

Англійскія караблі атакавалі французскі флот у Дакары

НЬЮ-ЙОРК, 10 ліпеня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, французскае марское міністэрства аб'явіла, што 8 ліпеня англійскія караблі атакавалі французскі флот у парту Дакар (французская ваенна-марская база ў Заходняй Афрыцы) пасля адмаўлення французскага адмірала прыняць англійскі ультыматум.

ЗАТРЫМАННЕ ФРАНЦУЗСКАГА ПАРАХОДА Ў СІНГАПУРЫ

ЛОНДАН, 10 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што англійскія марскія ўлады ў Сінгапуры затрымалі французскі параход «Іль дэ Франс» водазмяшчэннем у 43 тысячы тон.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР

(Памяшканне тэатра оперы і балета БССР)
ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДСКАГА ВЯЛІКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА імені ГОРКАГА
11 ліпеня
Н. Пагодзін. «КРЭМЛЁЎСКІЯ КУРАНТЫ»
Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. веч.
Білеты ў гарадскіх касах з 12 г. да 5 г. 30 м. і ў касе тэатра з 2 да 8 г. 30 м. веч.

Памяшканне Першага Белдзярждрамтэатра
Гастролі Другога Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра.
11, 12 ліпеня
Апошнія два паказы НАД БЯРОЗАЙ РАКОЙ
Пачатак у 8 г. веч. Білеты ў касе тэатра з 2 да 8 г. 30 м. вечара і ў гарадскіх касах.

Кінатэатр «Інтэрнацыянал»
11 ЛІПЕНЯ

Кінатэатр «Спартак»
ВОГНЕННЫЯ ГОДЫ

ДЗЯРЖЦЫРК
(парк імені Горкага)
тел. 22-725
Сёння працяг другога цыкла па новай ПРАГРАМЕ
Алі-Вад
са сваімі асістэнтамі і ліліпутамі.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
ДНЯМІ ГАСТРОЛІ лепшых ДЖЫГІТАЎ-НАЕЗНІКАЎ КАЎКАЗА
12 АЛІ-БЕК
пад кіраўніцтвам ордэнаноснага АЛІ-БЕКА

Кінатэатр «Чырвоная зорка»
ВЯЛІКІ ВАЛЬС

Кінатэатр «Родина»
ПРЫЯПЕЛІ

Дзіцячы кінатэатр
ЛЕНІН У 1918 ГОДЗЕ

Кінатэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. «Советское искусство» № 8.
2. Бібліятэка імені Леніна (кінанарыс).
3. Саюзкінажурнал № 59.
4. «Совецкая Беларусь» № 35.

Тэрмінова прадаецца РАЯЛЬ
Справіцца па адрасу: Мінск, абаронная, № 3, кв. 2 і па тэлефону 22-279 з 6 да 8 гадз. веч.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ
ЛЕТНІ ЗАКРЫТЫ ТЭАТР парк Ім. ГОРКАГА
11, 12 і 13 ліпеня
Справаздачныя канцэрты
КАЛЕКТЫВАЎ ФІЛАРМОНІІ, ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЧЫХ У ЗАКЛЮЧНЫМ КАНЦЭРЦЕ ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА У МАСКВЕ.
УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ:
АНСАМБЛЬ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ
ХОР, АРКЕСТР БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ, засл. арт. БССР ордэнаносцы Л. І. РЖЭЦКАЯ, Н. Ю. ГРЫГОНІС, арт. ШАПКО, лаўрэат Усесаюзнага конкурса выканаўцаў на народных інструментах І. І. ЖЫНОВІЧ.
У ПРАГРАМЕ СТАРАДАЎНІ БЕЛАРУСКІ ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД
І іншыя творы, выкананыя на заключным канцэрце дэкады.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты ў касе парка.

БЕЛВЯЗТРЭСТУ
на пастаянную работу
ПАТРАБУЮЦЦА:
ІНЖЫНЕР або ТЭХНІК па будматэрыялах,
СТ. БУХГАЛТАР,
ЭКАНАМІСТ па снабжэнню
І МАШЫНІСТКА.
ЗВЯРТАЦЦА: Мінск, Завальная 18.
Тэлефоны №№ 25-094 і 20-503.

ВЫДАВЕЦТВУ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»
патрабуецца ШОФЕР
ЗВЯРТАЦЦА:
Совецкая 49, другі паверх.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 20.000 (камутатар) дадатковы 102, намесніка адказнага рэдактара — 25-188, адказнага сакратара — 21.358, прыёмная рэдактара—21.352, літаратурнага сакратарыята—21.846, аддзелаў: партыйнага — 21 356 прапаганды — 21 885 совецка-гандлёвага — 21 399 прамыслова-транспартнага — 20 830 сельскагаспадарчага — 25 189, культуры і школ — 23 955, унутранай інфармацыі — 22-412, рабселькораў і пісем працоўных — 20.844, 21.845, агульны рэдакцыі—21 556, загадчыка выдавецтва — 21.358, выпускаючага — 24.768 карэктарскай — 21 357 бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 21-360.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

Уп. Галоўлітбелга № М—1994. Мінск. друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Ш.